Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№240 (28604)

13 СНЕЖНЯ 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ стар. 9–16



**Мэта — Беларусь інтэлектуальная**

СТАР. 2



**Хто стаў студэнтам года?**

СТАР. 5



**Вясковы гандаль — у новым фармаце**

МС

*ЛІЧБА ДНЯ*

**0,6%**

*склаў узровень зарэгістраванага беспрацоўя ў Беларусі сёлета на 1 снежня і не змяніўся ў адносінах да даных на 1 лістапада. У параўнанні з 1 снежня 2016 года ўзровень знізіўся на 0,2 працэнтнага пункта. На ўліку ў якасці беспрацоўных на 1 снежня 2017 года знаходзілася 24,1 тысячы чалавек, што на 32,6% менш, чым на 1 снежня 2016-га (35,8 тысячы чалавек). Наймальнікамі заяўлены звесткі аб наяўнасці на 1 снежня 2017 года 55,7 тысячы свабодных працоўных месцаў, што на 56,9% больш, чым на аналагічную дату 2016 года (35,5 тысячы). Каэфіцыент напружанасці на рынку працы краіны на 1 снежня 2017 года склаў 0,4 беспрацоўнага на адну вакансію (на 1 снежня 2016 года — 1,0).*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.12.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0296 | ▼ |
| Еўра | 2,3915 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0345 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0746 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

17240>

# «Гэй, Казу на Каляду!»



**Ксенія МІСЮРА з Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі г. Чэрвеня стала пераможцай рэгіянальнага этапу ў катэгорыі «Арт-аб'ект» з работай «Гэй, Казу на Каляду!»**

Выцінанка і мастацкі роспіс, кераміка і вышыўка, ткацтва і аўтарская лялька... І ўсё гэта — рукамі дзяцей! XXI Рэспубліканская выстава-конкурс дэкаратыўна-прыкладной творчасці навучэнцаў «Калядная зорка», якая ўрачыста адкрылася 11 снежня ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі ў Мінску, стала творчым стартам традыцыйнай святочнай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці».

Сёлета на выставе прадстаўлена больш за 560 індывідуальных і калектыўных творчых работ на тэмы «Зіма ў Беларусі», «Навагоднія казкі», «Зімовыя святы і іх героі». Самыя цікавыя, яркія і змястоўныя дзіцячыя работы рэспубліканскай выставы-конкурсу будуць прадстаўлены ў Палацы Рэспублікі ў рамках дабрачыннага навагодняга свята для дзяцей.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

■ Па сезоне

## НА МЕСЦЫ НЕ СЯДЗІЦЦА

### Што такое зімовы турызм у Беларусі?



**Для многіх звыкла сустракаць Новы год каля ёлкі, у кампаніі сямейнікаў ці сяброў, аднак ёсць і іншыя варыянты правесці зімовыя святы, напрыклад, набыць пуцёўку ці самім выправіцца ў падарожжа. Пра асаблівасці навагодняга беларускага турызму расказала генеральны дырэктар унітарнага прадпрыемства «Беларустурыст» — аднаго з тых, што займаюцца ўязным і ўнутраным турызмам, — Людміла СЯНЬКОЎСКАЯ.**

СТАР. 4

■ Занятасць

## Папярэднія заслугі не маюць значэння?

### Як тэхналогіі і час змяняюць рынак працы

**Прымаць персанал на работу будуць робаты, курсы па павышэнні прафесійнай падрыхтоўкі супрацоўнікі змогуць праходзіць па дарозе ў камандзіроўку, а наймальнікі навучацца ўспрымаць памылкі падначаленых як эксперыменты. Расказваем пра змены, якія ўжо цяпер адбываюцца на рынку працы.**

### Расце попыт у сферы продажаў і IT

Спачатку аб рэчах больш надзённых. Сёлета сітуацыя на рынку палепшылася. Па інфармацыі Міністэрства працы і сацабароны, цяпер у краіне налічваецца 56 тысяч вакансій, што на 49 працэнтаў больш, чым год таму. А колькасць афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных складае 25 тысяч чалавек (у аналагічны час летась гэты паказчык быў на 30 працэнтаў вышэйшы).

Пазітыўныя тэндэнцыі адзначаюць і на асобных рэсурсах па пошуку работы.

— З трэцяга квартала мінулага года колькасць вакансій пачала расці, і такая тэндэнцыя захоўваецца да канца 2017-га, — каментуе **кіраўнік аднаго з самых папулярных парталаў аб працаўладкаванні Святлана ШАПАРАВА.** — Гэта сведчыць аб тым, што эканамічная сітуацыя паляпшаецца, бо прадпрыемствы пашыраюцца, адкрываюць новыя кірункі. На першым месцы па росце вакансій сфера продажаў, на другім — інфармацыйныя тэхналогіі. Павялічыўся попыт таксама на рабочы персанал і кадры на вытворчасці. Пры гэтым колькасць рэзюмэ ў базе застаецца прыблізна на ранейшым узроўні: за год яна павялічылася літаральна на чатыры працэнты — гэта неістотна. Канкурэнцыя — сем рэзюмэ на адну пазіцыю. Гэта стабільная сітуацыя.

СТАР. 5

ЗВЯЗДА *Да чытача з любоўю!*

**ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ГАЗАВУЮ ПЛІТУ ЦІ МІКРАХВАЛЁЎКУ!**

**Працягваецца падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

# БЕЗ СУБ'ЕКТЫЎНЫХ ФАКТАРАЎ

## Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з прэм'ер-міністрам Малдовы

**Апошнія гады адносіны з гэтай постсавецкай краінай характарызуюцца інтэнсіўнасцю кантактаў. Кіраўнік нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ўжо сустракаўся сёлета — у чэрвені — з прэм'ер-міністрам Малдовы Паўлам Філіпам, а ў ліпені была рабочая сустрэча з Прэзідэнтам Малдовы Ігарам Дадонам. На гэтым тыдні кіраўнік малдаўскага ўрада зноў прыбыў у Мінск, каб прыняць удзел у пасяджэнні двухбаковай міжурадавай камісіі.**

Як адзначыў беларускі лідар, краіны знаходзяцца блізка адна ад адной, таму кантакты могуць быць яшчэ больш актыўнымі. Тым больш што ў Беларусі ёсць вялікі інтарэс да развіцця адносін з Малдовай, а Малдова зацікаўлена ў супрацоўніцтве з намі.

— Скажу шчыра, часта думаю пра былыя саюзныя рэспублікі, — прызнаўся кіраўнік нашай краіны. — Я ўжо казаў, што ў Малдове бываў не адзін раз у тыя часы: прыгожы край, які квітнее. Цудоўныя людзі, такія, як беларусы, працалюбівыя. Добрыя землі. У нас у плане тэхнікі, якая патрэбна вам, шмат чаго ёсць. Уся праблема ў тым, што ў нас няма такіх земляў і такога клімату, а ваша праблема ў тым, што ў Савецкім Саюзе ўсё машынабудаванне фактычна было сканцэнтравана ў Беларусі.

Тады абмен быў выдатна наладжаны, і ў краін не было ніякіх праблем. Але час прынёс шмат новага. Тым не менш, як падкрэсліў беларускі лідар, у нашых адносінах з Малдовай цалкам адсутнічае суб'ектыўны фактар:

— Ёсць здаровы сэнс. І калі патрэбна, мы гатовы аднавіць той узровень адносін — эканамічных, — які быў у часы Савецкага Саюза, таму што нічога іншага нам аднаўляць не трэба. Мы родныя, блізкія народы, мы ніколі не лічылі Малдову чужой дзяржавай пасля распаду Савецкага Саюза, мы перажываем за тое, што там адбываецца...

Нават сыходзячы з чыста прагматычных разлікаў, звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, наша краіна зацікаўлена ў развіцці Малдовы, у росце дабрабыту яе грамадзян. Логіка простая: калі гэта краіна стане эканамічна моцнай, яе патрэбнасць у супрацоўніцтве з Беларуссю павялічыцца:

— А ў нас будзе магчымасць працаваць на гэтым рынку, і калі ўжо так казаць, у большых аб'ёмах, — калі прагматычна. Але мы з гэтага не зыходзім, гэта не галоўнае. Галоўнае, каб дзяржавы існавалі — як адзіныя, цэласныя — не раздзеленыя, не раздробленыя, не парваныя на кавалкі. І каб на гэтых тэрыторыях шчасліва жылі людзі. Калі так будзе, тады прыйдзе і тавараабмен, да якога мы імкнёмся.

Кіраўнік Беларусі запэўніў прэм'ера Малдовы, што наш бок гатовы разглядзець прапановы па пашырэнні супрацоўніцтва:

— І калі ў вас будуць нейкія дадатковыя жаданні працаваць на беларускім рынку, у нас праблем не будзе. Бо вы да нас ідзяце з тымі таварамі, якія мы не вырабляем. Калі ў вас будзе магчымасць і жаданне, каб мы былі шырэй прадстаўлены ў Кішынёве і ў Малдове ў цэлым, будзьце ўпэўненыя, што мы гэта зробім хутка і аператыўна, як гэта мы ўмеем рабіць.

Павел Філіп падзякаваў кіраўніку нашай дзяржавы за магчымасць сустрэчы. Ён расказаў, што прыехаў у Беларусь у суправаджэнні дэлегацыі бізнесменаў, якія зацікаўленыя ў наладжванні адносін з беларускімі партнёрамі. Больш за тое, на думку кіраўніка малдаўскага ўрада, праведзенне пасяджэнняў міжурадавай беларуска-малдаўскай камісіі два разы на год (звычайная перыядычнасць — адзін раз на год) дае магчымасць аператыўна адсочваць дынаміку развіцця адносін паміж краінамі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# Фінансавыя стратэгіі

## Кіраўнік дзяржавы сустрэўся са старшынёй праўлення «Беларусбанка»

**Гэта лідзіруючы банк краіны. Падчас рабочай сустрэчы Аляксандр Лукашэнка выказаў спадзяванні Віктару Ананічу, старшыні праўлення адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк», што гэта фінансавая ўстанова захавае свае пазіцыі.**

— Спадзяюся, вы скажаце, што патрэбна зрабіць, каб «Беларусбанк» быў сапраўды галоўным банкам нашай дзяржавы, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я б хацеў пачуць, як увогуле сітуацыя ў галоўным банку, якія праблемы, што насцярожвае. Можа быць, вы мне падкажаце праз прызму «Беларусбанка», якая сітуацыя ўвогуле ў банкаўскай сістэме на ўзроўні камерцыйных банкаў.

Кіраўнік краіны пацікавіўся і стратэгіяй развіцця банка: што плануецца зрабіць у наступныя гады.

— Ведаю, што вы зусім нядаўна зацвердзілі стратэгію — да 2020 года. У чым яе сутнасць? І на што мы ў выніку гэтага выйдзем? Гэта пражэкты ці гэта заснавана на нейкай базе, калі мы плануем дасягнуць нейкіх вяршынь у банкаўскім бізнесе.

Па выніках сустрэчы з Прэзідэнтам Віктар АНАНІЧ, старшыня праўлення адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк», расказаў журналістам:

— Кіраўніку дзяржавы было даложана аб рабоце банка сёлета, пра тое, што банк з'яўляецца асноўным крэдытарам беларускай эканомікі. У гэтым годзе асноўная ўвага надавалася крэдытаванню малога і сярэдняга бізнесу. Банкам выкананы ўсе нарматывы бяспечнага функцыянавання, якія закладзены Нацыянальным банкам. У цэлым атрымана станоўчая ацэнка кіраўніка дзяржавы па выніках работы банка.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Ва ўрадзе

# СТАРШЫНСТВА ПЕРАДАЛІ ХАРВАТЫІ

## У Мінску прайшла сустрэча кіраўнікоў урадаў краін — удзельніц Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы

**На пасяджэнні былі прыняты план дзеянняў на 2018—2020 гады. Прэм'ер-міністр нашай краіны Андрэй КАБЯКОЎ адзначыў, што Цэнтральна-Еўрапейская ініцыятыва запатрабавана як пляцоўка для дыялогу і супрацоўніцтва па шырокім коле пытанняў.**

Сярод іх адно з найбольш важных — развіццё лагістычнай і транспартнай інфраструктуры, у тым ліку ў кантэксце стварэння эканамічнага пояса Шаўковага шляху. «Усе краіны нашага рэгіёна і Кітай аб'ядноўвае жывы інтарэс да супрацоўніцтва ў гэтай сферы», — сказаў Андрэй Кабякоў. Беларусь падчас свайго старшынства імкнулася надаць дынаміку сінхранізацыі планаў па сумесным пашырэнні транспартнай інфраструктуры, збліжэнні стандартаў, спрашчэнні мытных працэдур і развіцці лагістыкі.

Таксама прэм'ер-міністр адзначыў яшчэ два важныя пытанні, па якіх краіны абменьваюцца вопытам: міграцыя і барацьба з тэрарызмам, у тым ліку з кіберзлачынствамі. Дарэчы, у кастрычніку 2018 года Беларусь будзе прымаць канферэнцыю высокага ўзроўню ААН і АБСЕ, прысвечаную прадухіленню тэрарызму і барацьбе з ім у лічбавую эпоху.

Кіраўніцтва ЦЕІ высока ацаніла сёлетняе старшынства Беларусі, пра што паведаміла альтэрнатыўны генеральны сакратар ЦЕІ Маргот Клестыль-Лёфлер. Яна таксама адзначыла, што падрыхтаваны план на наступныя тры гады ўлічыў прапановы ад краін-удзельніц.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Нашы дзеці

# ДАРОСЛЫЯ ЧАРАЎНІКІ

**Дзед Мароз, Снягурка, мядзведзь ды іншыя казачныя госці завіталі днямі ў сям'ю КАПЫТОК у Навагрудку. Святам у гэтым дзіцячым доме сямейнага тыпу, дзе Таццяна і Павел крыху больш як год выхоўваюць семярых дзетак, у раёне пачалася дабрачынная акцыя «Нашы дзеці».**

Сёлета яе збіраюцца правесці асабліва маштабна. Падчас калядных і навагодніх свят толькі ўстановы культуры Навагрудскага райвыканкама запланавалі больш за 140 прадстаўленняў, ранішнікаў, спектакляў.

— Мы хочам акружыць увагай і клопатам кожнае дзіця. Ранішнікі з навагоднімі карагодамі і гульнямі пройдуць ва ўсіх установах адукацыі, — паабяцала **Святлана КАРАЛЬКО, намеснік старшыні Навагрудскага райвыканкама.** — За сродкі раённага бюджэту набыта 2174 падарункі на 21 370 рублёў. А прадстаўнікі рэлігійных арганізацый наведаюць дзетак, якія знаходзяцца ў аддзяленнях дзіцячага прытулку сацыяльна-педагагічнага цэнтра. А таксама сем'і, дзе малых выхоўваюць толькі таты.



**Работнікі Навагрудскага райвыканкама і раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці разам з арганізацыямі «Белая Русь», Беларускі саюз жанчын і БРСМ зладзілі для сямейства КАПЫТОК сапраўднае свята з песнямі, карагодамі, гульнямі, прысмакамі ды падарункамі.**

Валанцёрскія атрады ўстаноў адукацыі зладзяць казку таксама для малечаў, што трапілі ў перадсвяточны час у дзіцячае аддзяленне бальніцы. Стаць чараўнікамі для хлопчыкаў і дзяўчынак пастараюцца таксама дарослыя з арганізацый «Белая Русь», Беларускі саюз жанчын, БРСМ і Чырвоны крыж.

А ветэраны і адзінокія грамадзяне атрымаюць віншавальныя паштоўкі ад школьнікаў і валанцёраў у межах раённай акцыі «Падары цеплыню сваёй душы».

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

■ Падзея

# ПРЭЗІДЭНТ НА З'ЕЗДЗЕ ВУЧОНЫХ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сёння прыме ўдзел у пленарным пасяджэнні II з'езда вучоных Рэспублікі Беларусь, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Удзельнікі пасяджэння абмяркуюць актуальныя задачы і прыярытэты доўгатэрміновага развіцця айчыннай навукі і тэхналогій. Асобная ўвага будзе ўдзелена найбольш перспектыўным кірункам, пытанням умацавання кадравага патэнцыялу і матывацыі моладзі да навуковай дзейнасці.

На мерапрыемства запрошаны вышэйшыя службовыя асобы краіны, кіраўнікі дзяржаўных органаў, арганізацый Нацыянальнай акадэміі навук і прадпрыемстваў рэспублікі, парламентарыі, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, ВНУ, міжнародных арганізацый, дыпламатычнага корпуса. Гасцямі пленарнага пасяджэння стануць навукоўцы з Азербайджана, Арменіі, Балгарыі, Казахстана, Кітая, Латвіі, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана, Украіны.

# БЕЛАРУСЬ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ

**— Стратэгія «Навука і тэхналогіі: 2020—2040» — не нарматыўны дакумент, а дакумент прагнастычнага характару, які дазваляе акрэсліць контуры будучыні Беларусі, той будучыні, куды мы ўсе павінны скіраваць свае погляды. Фактычна гэта канцэпцыя фарміравання Беларусі інтэлектуальнай, — паведаміў у сваім выступленні перад дэлегатамі II з'езда вучоных, які ўчора распачаў сваю работу ў Мінску, дырэктар Цэнтра сістэмнага аналізу і стратэгічных даследаванняў НАН Беларусі Валерый ГАНЧАРОЎ. — У стратэгіі прапісаны асноўныя вектары, механізмы і інструменты дасягнення пастаўленай мэты. Галоўнае — яна вызначае прыярытэты нашага развіцця на найбліжэйшую перспектыву, якія дазволяць дасягнуць высокіх тэмпаў росту эканомікі, якасці жыцця насельніцтва і канкурэнтаздольнасці нашай краіны ў свеце.**

Паўза паміж першым і другім з'ездамі навукоўцаў склала дзесяць гадоў. Гэта было дзесяцігоддзе бурнага развіцця тэхналогій у свеце і з'яўлення новых кірункаў. У першы дзень работы з'езда дэлегаты працавалі ў дзевяці секцыях: «Фізіка і інфарматыка ў тэхналогіях будучыні», «Тэхнічныя навукі — Індустрыя 4.0», «Сучасная хімія і рацыянальнае прыродакарыстанне», «Сучасныя біятэхналогіі», «Медыцынскія і фармацэўтычныя навукі», «Айчынная гуманітарыстыка — грамадству», «Інавацыйны аграпрамысловы комплекс» і «Моладзь і новыя гарызонты навукі».

У сваім выступленні на секцыі «Сучасныя біятэхналогіі» **акадэмік-сакратар Аддзялення біялагічных навук НАН Беларусі Міхаіл НІКІФАРАЎ** паведаміў, што беларускія навукоўцы працуюць сёння над наначасціцамі для адраснай дастаўкі лекаў у арганізм чалавека. «Навука ўскладае вялікія надзеі на біятэхналогіі не толькі ў плане стварэння новых лекавых прэпаратаў, але і ў плане распрацоўкі новых спосабаў іх дастаўкі ў наш арганізм. Агульнавядома, што лячэнне шматлікіх хвароб суправаджаецца пабочнымі эфектамі. Лекавая субстанцыя ў арганізме на нешта ўздзейнічае ў патрэбным кірунку, да прыкладу, на ракавыя клеткі, але пры гэтым яна ўздзейнічае на іншыя клеткі, — растлумачыў ён. — Беларускія біяфізікі і біяхімікі распрацоўваюць рэчывы, якія спросцяць адрасную дастаўку лекавых рэчываў менавіта ў патрэбныя (хворыя) клеткі, не закранаючы іншыя. Гэта мае велізарнае значэнне, і магу з упэўненасцю сказаць, што мы знаходзімся ў сусветным трэндзе развіцця навукі».

Міхаіл Нікіфараў падкрэсліў, што біятэхналогіі прымяняюцца ў многіх сферах жыццядзейнасці чалавека (медыцыне, энергетыцы, харчовай прамысловасці, сельскай гаспадарцы) і маюць вялікія эканамічныя перспектывы. Толькі за апошнія дзесяць гадоў навукоўцы Інстытута мікрабіялогіі Нацыянальнай акадэміі навук ажыццявілі больш за 50 распрацовак сусветнага ўзроўню.

У секцыі, прысвечанай маладзёжнай навуцы, прыняў удзел **міністр адукацыі нашай краіны Ігар КАРПЕНКА.**

— Ва ўстановах вышэйшай адукацыі вядзецца сістэмная работа па ўключэнні студэнцкай моладзі ў навукова-даследчую дзейнасць, — паведаміў кіраўнік галоўнага адукацыйнага ведамства. — Найлепшыя студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі, інтэлектуальныя і творчыя аб'яднанні студэнтаў маюць магчымасць атрымаць фінансавую падтрымку ад спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Акрамя гэтага, лаўрэатам спецыяльнага фонду Прэзідэнта аказваецца сацыяльная падтрымка. Гэта і павышаная стыпендыя, і перавага пры размеркаванні, і ўключэнне па-за чаргой у спісы на атрыманне льготных крэдытаў для набыцця жылля...

Разам з тым патрабуюцца дадатковыя стымулы для прытоку ў сферу навукі маладых кадраў, у тым ліку маладых кадраў найвышэйшай кваліфікацыі. Вывучыўшы міжнародны вопыт, Міністэрства адукацыі сумесна з Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях прапрацоўвае пытанне праванога магчымасці ўвядзення базавага фінансавання навукі ва ўстановах вышэйшай адукацыі. «Гэта дасць ВНУ права самастойна распараджацца сродкамі і вызначаць у якасці прыярытэтных кірункаў расходавання фінансаў не толькі ўласна навуковыя даследаванні, але і стымуляванне студэнцкіх навуковых аб'яднанняў, аплату ўдзелу студэнтаў і супрацоўнікаў ВНУ ў канферэнцыях, закупку абсталявання і расходных матэрыялаў для навуковых даследаванняў, якія праводзяць студэнты, а таксама на іншыя мэты», — паведаміў міністр.

Таксама Міністэрства адукацыі прапрацоўвае пытанне аб выдзяленні крэдыту Сусветнага банка на мадэрнізацыю вышэйшай адукацыі Беларусі. У выпадку станоўчага вырашэння пытання сродкі будуць накіраваны на развіццё інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і інавацыйнай інфраструктуры ўстаноў вышэйшай адукацыі і рэалізацыю канцэпцыі «Універсітэт 3.0». У сваю чаргу, укараненне ў практыку мадэлі «Універсітэт 3.0» прывядзе да станаўлення новай фармацыі ўніверсітэта, захавае моладзь ва ўніверсітэцкай навуцы і павысіць канкурэнтаздольнасць вышэйшай адукацыі ў сусветнай адукацыйнай прасторы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Напярэдадні

# МАШТАБНЫЯ ЗНІЖКІ, ТОНЫ ЦУКЕРАК І ПЯТНАЦЦАЦІХВІЛІННЫ САЛЮТ

## Як сталіца будзе адзначаць навагоднія святы



**Афіцыйным стартам святочнага сезона можна лічыць 15 снежня. Менавіта да гэтага дня горад будзе цалкам упрыгожаны, запаліцца маляўнічая ілюмінацыя, і пачнуць працаваць калядныя кірмашы. Насычаная праграма разлічаная аж да сярэдзіны студзеня: за гэты перыяд у сталіцы пройдзе некалькі сотняў мерапрыемстваў, а ў навагоднюю ноч можна будзе павесяліцца на 22 пляцоўках у розных месцах горада.**

Галоўная ёлка краіны з удзелам Прэзідэнта, арганізаваная для дзяцей, якія апынуліся ў складаней жыццёвай сітуацыі, пройдзе 22 снежня, а 27 снежня ў Белдзяржцырку адбудзецца прадстаўленне для падапечных акцыі «Нашы дзеці». Як расказаў **намеснік начальніка ўпраўлення культуры галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама Аляксандр ШАСТАКОЎ**, традыцыйнае шэсце Дзядоў Марозаў у гэтым годзе запланавана на 17 гадзін 23 снежня. Больш за 800 казачных персанажаў пройдзе ад Плошчы Незалежнасці да пляцоўкі каля Палаца спорту, завершыцца шэсце танцавальным флэшмобам. Назіраць за святочнай падзеяй таксама можна будзе на вялікіх экранах, усталяваных у цэнтры горада. Дарэчы, сёлета ў ёй таксама прымуць удзел прадпрыемствы сталіцы. Калі патрапіць на казачны парад не атрымліваецца, хваляваца не варта: у Верхнім горадзе з 25 снежня па 5 студзеня штодня ў 17.00 і ў 20.30 будзе праходзіць прадстаўленне «Навагодняя прыгода ў краіне чараўніцтва».

Што датычыцца навагодняй ночы, то асноўная пляцоўка разгернецца каля Палаца спорту, свята будзе доўжыцца з 23 да 4 гадзін раніцы. Феерверкшоу, працягласцю 15 хвілін, пачнецца ў 1.30.

Работа елачных кірмашоў — іх у сталіцы будзе больш за 200 — стартуе 22 снежня. Спецыяльна да свят крамы горада правядуць больш за 2,5 тысячы акцый па зніжэнні цэн. Цяпер праходзіць конкурс на найлепшае афармленне гандлёвага аб'екта: падаць заяўкі можна да 15 снежня, вынікі конкурсу будуць падведзеныя напярэдадні Новага года. 25, 31 снежня і 7 студзеня магазіны будуць адкрыты паводле рэжыму працоўнага дня, 1 студзеня мінімальны перыяд работы прадуктовых крамаў з 10 да 17, нехарчовыя ж па рашэнні кіраўніцтва могуць быць зачыненыя на дадатковы выхадны. У перыяд правядзення навагодніх карпаратываў час работы аб'ектаў грамадскага харчавання, за выключэннем тых, якія знаходзяцца ў жылых дамах, можа быць падоўжаны да 6-й раніцы.

— Для жыхароў сталіцы ўжо нарыхтавана 2,5 мільёна бутэлек шампанскага і ігрыстых вінаў, больш за 500 тысяч набораў цукерак. Цана на салодкі падарунак вагаецца ад 4,5 да 50 рублёў, у залежнасці ад яго складу і аб'ёму, — адзначыў **намеснік начальніка аддзела арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Аляксандр ФРАЛОЎ.**

Усе месцы масавага збору людзей будуць ахоўвацца супрацоўнікі міліцыі, там, дзе збярэцца больш за 500 чалавек, будуць усталяваныя пункты пропуску. МУС нагадвае, што на пляцоўкі забаронена праносіць небяспечныя прадметы і алкаголь, грамадзяне ў стане моцнага ап'янення на свята таксама не будуць допушчаныя. Трэба памятаць, што піратэхнічныя сродкі нельга падрываць у грамадскіх месцах, для сваёй жа бяспекі іх варта купляць у ліцэнзійных крамах. ДАІ горада рэкамендуе ўстрымацца ад паездкі на ўласным транспарце да месцаў мерапрыемстваў.

І скарыстацца такой парадай можна без боязі, абяцаюць, што грамадскі транспарт у святочныя дні будзе працаваць як гадзіннік. Ужо пушчаныя дадатковыя саставы 1-га і 100-га аўтобусаў. Метро ў навагоднюю ноч будзе працаваць да 4 раніцы, пад прыбыццё апошняга цягніка будзе падладжана работа наземнага транспарту. **Начальнік арганізацыі пасажырскіх перавозак дзяржаўнай установы «Сталічны транспарт і сувязь» Аляксандр КАПЦЮХ** запэўніў, што час чакання транспарту будзе складаць не больш за 20 хвілін.

Азнаёміцца з падрабязнай праграмай святочных мерапрыемстваў можна на сайце Мінгарвыканкама.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Добрая навіна

## ГЛУСЧАНЕ ЗНОЎ З БАСЕЙНАМ

**Яго адкрыцця пасля рэканструкцыі жыхары чакалі з асаблівым нецярпеннем. Грошай на яго рэканструкцыю не хапала, і мясцовыя ўлады звярнуліся па дапамогу ў Магілёўскі аблвыканкам.**

Цяпер да паслуг жыхароў — тры дарожкі даўжынёй 25 метраў, зала так званага сухога плавання для навучання дзяцей уменню трымацца на вадзе, трэнажорная зала, памяшканні для заняткаў настольным тэнісам і турызмам, шахматны клуб. На рэканструкцыю пайшоў адзін мільён 243 тысячы рублёў, без уліку абсталявання. 200 тысяч з гэтай сумы выдзеліла Міністэрства лясной гаспадаркі.

— Гэта сапраўды прыемная падзея для раёна, — паведаміў карэспандэнту «Звязды» **галоўны спецыяліст аддзела адукацыі, спорту і турызму Глускага райвыканкама Ігар СУШЧЭНЯ.** — Ужо складзены графік наведвання басейна гарадской школай, будзе арганізаваны падвоз дзяцей з раёнаў. Тут створаны ўмовы для інвалідаў. Набыты спецыяльны пад'ёмнік і прыстасаванне для спуску на ваду.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Не парушай!

# Рэклама без згоды — падстава для праблем

**З 20 снежня перастане існаваць ТАА «Твая кватэра». Ліцэнзіі на права займацца рыэлтарскімі паслугамі агенцтва пазбаўлена за незаконнае рэкламаванне жылля ў арэнду без згоды яго ўласнікаў і адпаведных дагавораў.**

Як пісала «Звязда», Міністэрства юстыцыі Беларусі папярэджвала ўсе агенцтвы, што пры нядбайнай працы яны павінны быць гатовыя да адпаведнага пакарання. Тым больш што ў кастрычніку «Твая кватэра» ўжо атрымлівала ад міністэрства прадпісанне аб ліквідацыі выяўленых парушэнняў. Кампанія пісьмова паведаміла Мінюсту, што ўсё выпраўлена. Аднак яе супрацоўнікі працягвалі займацца тымі ж самымі махлярствамі.

Прадстаўнікі агенцтва размяшчалі рэкламу вялікай колькасці аб'ектаў, каб прыцягнуць да сябе больш спажыўцоў. Чалавек, зацікавіўшыся пэўнай кватэрай, плаціў кампаніі 115 рублёў за паслугу, аднак рэальнай дапамогі не атрымліваў, паведамілі ў Мінюсце.

У выніку кіраўнік арганізацыі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці. А агент па аперацыях з нерухомасцю пазбаўлена права аказваць рыэлтарскія паслугі. Спецыяліст давала кліентам няпоўную інфармацыю пра кватэры, прапанаваныя да найму. За гэта дзейнасць яе ідэнтыфікацыйнай пластыкавай карткі прыпынена на год.

Не забяспечвалі аказанне рыэлтарскіх паслуг адпаведна патрабаванням заканадаўства і два агенты па аперацыях з нерухомасцю рыэлтарскай арганізацыі "Твая сталіца". Вярнуцца ў прафесію яны змогуць таксама толькі праз год, дадалі ў Мінюсце.

Каб скасаваць заключаны з «Твоей кватэрай» дагавор на аказанне рыэлтарскіх паслуг, прадстаўнікі міністэрства раяць звяртацца ў гэтае агенцтва. Прынамсі, сама арганізацыя, якая спыняе сваё існаванне, павінна папярэдзіць сваіх кліентаў пра скасаванне дагавораў на працягу трох дзён.

Спажыўцы, якія заключылі дагавор і ўжо аплацілі паслугу, могуць скасаваць яго стандартнымі спосабамі, што павінны быць прапісаны ў дакуменце: шляхам перагавораў або праз судовае рашэнне. Тым, хто ўжо аплаціў паслугу, але не атрымаў яе, агенцтва павінна не толькі скасаваць дагавор, але і вярнуць грошы.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Лепш папярэдзіць

# НЕЛЬГА ПРЫПЫНЯЦЬ

**У канцы студзеня наступнага года аблвыканкамы павінны забяспечыць укараненне дзяржсацзаказу ў галіне прафілактыкі ВІЧ/СНІДу ў групах рызыкі і для сацыяльнага суправаджэння людзей з ВІЧ.**

Доўгі час гэты фінансавы складнік браў на сябе Глабальны фонд для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй, аднак налета краіна павінна самастойна, без падтрымкі замежнага донара, працягнуць пачатую работу.

Міжнародныя донары, якія займаліся гэтым напрамкам, ужо не бачаць неабходнасці працягу фінансавання Беларусі — краіна дарасла да самастойнага вырашэння падобных праблем.

— Але сёння не ва ўсіх рэгіёнах ёсць разуменне таго, наколькі важна выдаткоўваць на гэта сродкі, — кажа **старшыня каардынацыйнага камітэта асацыяцыі некамерцыйных арганізацый па процідзеянні эпідэміі ВІЧ/СНІДу «БелСетка антыСНІД» Алег ЯРОМІН.** — Грамадскія арганізацыі бачаць рызыку, звязаную з парушэннем бесперапыннасці такой работы. Ёсць сумненне ў тым, што праграмы дзяржаўнага сацыяльнага заказу будуць рэалізоўвацца для такіх катэгорый, як жанчыны секс-бізнесу або мужчыны, якія маюць секс з мужчынамі. Між тым праз іх інфекцыя распаўсюджваецца ў агульнай папуляцыі.

Дзякуючы фінансаванню Глабальнага фонду для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй летась звыш 47 тысяч наркаспажыўцоў атрымалі пакет прафілактычных паслуг. Сэрвісамі грамадскіх арганізацый скарысталіся і 10 тысяч мужчын, якія маюць секс з мужчынамі, а таксама звыш 1 тысячы жанчын, якія аказваюць камерцыйныя секс-паслугі. Яшчэ 270 чалавек з ВІЧ былі падтрыманы па сацыяльным суправаджэнні і паліятыўным доглядзе.

Дзякуючы ўсё яшчэ сумеснай рабоце Глабальнага фонду і Міністэрства аховы здароўя пакуль год ад году павялічваецца колькасць пратэсціраваных на ВІЧ у групах рызыкі. Працягваецца ўкараненне саматэсціравання ў Мінску і Гомельскай вобласці, дзе ў аптэках можна купіць спецыяльныя экспрэс-тэсты па сліне. Вопыт трэба распаўсюдзіць у наступным годзе на ўсю краіну. Гэта павінна спрыяць таму, каб у найбліжэйшыя гады былі выяўлены 90 працэнтаў інфіцыраваных — з мэтай іх далейшага лячэння і зніжэння вірусной нагрузкі. У такім выпадку ВІЧ-станоўчы чалавек перастане быць крыніцай інфекцыі.

«Мы спадзяёмся, што да сярэдзіны наступнага года механізмы дзяржаўнага сацыяльнага заказу пачнуць працаваць», — заўважае **намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Беларусі Іна КАРАБАН.** А **ўрач-дэрматавенеролаг Магілёўскага абласнога скурна-венералагічнага дыспансера Ларыса КРУКАВА** кажа, што работа грамадскіх арганізацый з уразлівымі групамі надзвычай складаная і страціць напрацаваны патэнцыял ніяк нельга.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Трамп абвясціў аб падрыхтоўцы новай высадкі на Месяц

Прэзідэнт ЗША падпісаў указ, які даручае NASA пачаць «інавацыйную праграму асваення космасу, каб зноў адправіць амерыканскіх астранаўтаў на Месяц».

Трамп заявіў, што ЗША плануюць застацца лідарамі ў вывучэнні космасу. «Мы — лідары, мы застанёмся лідарамі, і мы збіраемся павялічыць нашу перавагу ў шмат разоў», — заявіў Трамп. Па словах прэзідэнта ЗША, новы ўказ «з'яўляецца важным крокам на шляху да вяртання астранаўтаў на Месяц, упершыню з 1972 года». Дырэктыва стварае падмурак не толькі для новай месяцавай місіі, але і для палёту на Марс, дадаў Трамп.

Як адзначае АР, Трамп — не першы прэзідэнт ЗША, які абяцае аднаўленне месяцавай праграмы. Прэзідэнты Джордж Буш і Джорд Буш-малодшы таксама абяцалі вярнуць амерыканскіх астранаўтаў на Месяц, але бюджэтныя абмежаванні адкарэктавалі іх планы.

Трамп падпісаў дырэктывы ў прысутнасці былых і цяперашніх астранаўтаў, у тым ліку другога чалавека, які высадзіўся на Месяцы, База Олдрына і былога астранаўта місіі «Апалон-17» Харысана Шміта. «Апалон-17» — апошняя амерыканская касмічная місія, якая мела на мэце высадку на Месяцы. Яна завяршылася ў снежні 1972 года.

### У Расіі прадухілілі тэракты, якія рыхтаваліся на Новы год

ФСБ Расіі спыніла дзейнасць тэрарыстычнай групоўкі, якая планавала тэракты з удзелам смяротнікаў падчас навагодніх свят і перад выбарамі прэзідэнта Расійскай Федэрацыі. Пра гэта заявіў дырэктар ФСБ, старшыня Нацыянальнага антытэрарыстычнага камітэта Аляксандр Бортнікаў, паведамляюць інфармагенцтвы.

Удакладняецца, што члены групоўкі — выхадцы з краін Цэнтральнай Азіі. Яны планавалі свае вылазкі ў Маскоўскім рэгіёне. Па словах Аляксандра Бортнікава, у тэрарыстаў канфіскаваныя самаробныя выбуховыя прыстасаванні, агнястрэльная зброя і боепрыпасы, а таксама ліквідаваная лабараторыя па вырабе сродкаў тэрору.

Дырэктар ФСБ праінфармаваў, што з 9 па 11 снежня ліквідаваны дзве законспіраваныя тэрарыстычныя групы, кіраўніцтва якімі ажыццяўлялася з-за мяжы верхаводамі так званай Ісламскай дзяржавы, яшчэ адна ячэйка была ліквідаваная ў Стаўрапалі.

### Унук Індзіры Гандзі стаў на чале найстарэйшай партыі Індыі



47-гадовы Рахул Гандзі пайшоў па шляху сваіх славутых продкаў — прадзеда, бабулі, бацькі і маці — і стаў лідарам Індыйскага нацыянальнага кангрэса. Гэта найстарэйшая і самая ўплывовая партыя, заснаваная ў Індыі ў 1885 годзе. Соня Гандзі, маці Рахула, узначальвала яе на працягу 19 гадоў. Прадзед палітыка, Джавахарлал Нэру, з'яўляўся першым прэм'ерам краіны пасля здабыцця ёю незалежнасці. Пры гэтым Махатма Гандзі з'яўляецца для гэтай дынастыі цёзкам па прозвішчы. Цяпер на чале Індыі знаходзіцца прадстаўнік партыі «Бхаратыя джаната парты» Нарэндра Модзі. Індуіскі нацыяналістычны лідар Рам Натх Ковінд мінулым летам стаў прэзідэнтам краіны. Ён таксама належыць да «Бхаратыі».

# НА МЕСЦЫ НЕ СЯДЗІЦЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Зімовы сезон для турфірмаў пачынаецца яшчэ ў ліпені-жніўні. Самыя актыўныя продажы пуцёвак прыходзяцца на верасень, калі арганізацыі, што займаюцца рэкрэацыйнымі паслугамі, перадаюць дакладныя назвы праграм, іх апісанне і кошт удзелу ў мерапрыемствах. Вялікая папулярнасць у начных экскурсій па ўпрыгожанаму, пераднавагодняму Мінску і па іншых буйных гарадах. У Віцебску спецыяльна для турыстаў адчыняюць краму, каб тыя маглі купіць сувеніры ў апошнія гадзіны старога года. «Беларустурыст» не часта працуе з асобнымі вандроўнікамі, большасць маршрутаў разлічана на групы. На гэты момант на навагоднія святы ўсе месцы ў гасцініцах і на турбазах ужо прададзеныя, ідуць апошнія дні, калі людзі ўносяць плату за забраніраваныя месцы.



***— Наколькі камфортна дабірацца да турыстычных аб'ектаў па зімовых дарогах?***

— Непасрэдна ў нас праблем з транспартам няма. Калі гаварыць пра прыдарожны сэрвіс, то ўздоўж асноўных трас па Беларусі дастаткова месцаў для адпачынку. Наладжана абслугоўванне на заправачных станцыях, па ўзроўні іх можна параўнаць нават з еўрапейскімі стандартамі. Гэтым Беларусь у добры бок адрозніваецца ад іншых краін постсавецкай прасторы. Вандроўнікі маюць магчымасць схадзіць у прыбіральню, выпіць кавы, з'есці бутэрброд, круасан, а то і традыцыйны дранік. Да турбаз, якія размешчаны ў лясах, таксама арганізуецца заезд.

**«Расіяне заўсёды цікавяцца тэматыкай Вялікай Айчыннай вайны, а еўрапейскія госці — эпохай Напалеона і перыядам Першай сусветнай вайны».**

***— Апошнім часам у Беларусі з'явілася многа мясцін, якія прасоўваюць уласны навагодні «брэнд», напрыклад, у палескага Дзеда Мароза з'явіўся канкурэнт з Прыдзвіння — Зюзя Паазерскі. Наколькі ахвотна людзі выбіраюць новыя маршруты?***

— Багацце навагодніх праграм дазваляе адзначаць свята ў сваёй мясцовасці. Не ўсе маюць час, сродкі ці ахвоту выбірацца ў іншую вобласць да зімовага чараўніка. А калі такі «дзядуля» побач і пры гэтым арганізатары пастараліся з праграмай, надалі мерапрыемству самабытнасці, то свята толькі набудзе станоўчых рысаў. Адзінае — хочацца пажадаць мясцовым арганізатарам трымацца высокага ўзроўню. Цяпер нават у невялікай сядзібы ёсць шанц заявіць пра сябе, прарэкламавацца ў інтэрнэце. Важна не сапсаваць адпачынак і не пашкодзіць уражанню ад краіны, калі праграма падрыхтавана для замежнага турыста. На жаль, сёння арганізацыя свят адбываецца даволі хаатычна, інакш кажучы, кожны ладзіць мерапрыемствы «па меры магчымасцяў». На маю думку, ёсць сэнс зрабіць цэнтралізаваны падыход, сертыфікаваць сцэнарыі, калі іх мяркуюць паказваць перад гасцямі.

***— Усё часцей да нас завітваюць групы турыстаў з далёкага замежжа. Якая сітуацыя з перакладчыкамі і гідамі, здольнымі весці экскурсію на замежнай мове?***

— Тут ёсць пэўныя цяжкасці. Для спецыялістаў такога ўзроўню патрэбна падрыхтоўка — не толькі дасканалае веданне мовы, але і ўменне цікава выкладаць матэрыял экскурсіі. Гіды-перакладчыкі кожныя пяць гадоў праходзяць атэстацыйную праверку. Сёння поўнасцю працаваць на англійскай мове могуць 30 гідаў, на французскай, нямецкай — напалову менш, сямёра валодаюць іспанскай, і нядаўна атэставалася пяць чалавек, якія размаўляюць на кітайскай. Цікава, што многія групы,



напрыклад, з Кітая, Карэі, В'етнама не хочуць, каб экскурсію адразу вялі на іх мове. Ім камфортней скарыстацца паслугай перакладчыка са свайго боку.

***— Ці ёсць у замежнага турыста магчымасць самастойна знаёміцца з Беларуссю?***

— У сувязі з бязвізавым пяцідзённым уездам у Беларусь мы распрацавалі асаблівы маршрут для іншаземцаў. Канешне, нам як аператарам у будучым хацелася б большы тэрмін «бязвізу». Пяць дзён разам з прыездам і выбыццём — гэта толькі тры паўнавартасныя дні на знаёмства з краінай. Таму сёлета пераважаў бізнес-турызм, калі чалавек прыязджаў да нас па справах і як дадатак аглядаў культурныя, гістарычныя помнікі. Такім чынам абсалютная большасць гасцей заставалася ў Мінску, да дальніх рэгіёнаў фізічна не хапала часу даехаць. Што датычыцца «бязвізу» на тэрыторыі Гродна і Аўгустоўскага канала, на мой погляд, там карысць ад бязвізавага рэжыму была самая заўважная.

Для вандроўнікаў, якія перасякаюць нашу краіну транзітам, распрацаваны спецыяльныя карты на англійскай і рускай мовах. Яны дазваляюць самастойна спланаваць маршрут. Напрыклад, на «англійскай» карце прадстаўлена 18 маршрутаў, на адваротным баку аркуша надрукавана іх апісанне, спіс гатэляў і турбаз побач, план Мінскага метрапалітэна. Чаму карты адрозніваюцца паміж сабой? Гэта звязана з інтарэсамі гасцей. Расіяне заўсёды цікавяцца тэматыкай Вялікай Айчыннай вайны, а еўрапейскія госці — эпохай Напалеона і перыядам Першай сусветнай вайны.

**«Пяць дзён разам з прыездам і выбыццём — гэта толькі тры паўнавартасныя дні на знаёмства з краінай. Таму сёлета пераважаў бізнес-турызм, калі чалавек прыязджаў да нас па справах і як дадатак аглядаў культурныя, гістарычныя помнікі».**

***— У якім кірунку сёння развіваецца навагодні турызм? Для беларусаў гэта па-ранейшаму традыцыйнае свята, ці цяпер людзі жадаюць нязвыклага адпачынку?***

— Усё залежыць ад катэгорыі, да якой адносяцца нашы турысты. Моладзь з задавальненнем выпраўляецца ў горы катацца на лыжах, дзеці да 15 гадоў абавязкова чакаюць падарункаў пад ёлкай і казачных персанажаў. Людзі, якія хочуць традыцыйнага свята, але з новым напаўненнем, едуць у госці да Балотніка ў Бярэзінскі запаведнік, на Віцебшчыну да Зюзі Паазерскага ці ў Школу паласатых эльфаў — сядзібу пад Мінскам, дзе маленькія госці ўласнаручна ўпрыгожваюць пернікі, якія потым забіраюць з сабой. Аматары бясконцых снежных прастораў могуць пакатацца на сабачай запрэжцы і пажыць у юрце — такую паслугу прапануе адна з сядзіб побач з Барысавам.

Але і Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы забываць не след. Гэта наша класіка і на наведванні рэзідэнцыі завязаны заездны турызм. Сёння Дзядуля з Белавежы ўваходзіць у пяцёрку самых лепшых Дзедаў Марозаў свету. А гэта, што ні кажы, прыемна.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

**❍ У тэму**

## Ад 5 да 90

### Кіраўнік МЗС не выключыў магчымасць павялічыць бязвізавае гасцяванне

**Міністр замежных спраў Уладзімір Макей не выключае ўвядзення 90-дзённага бязвізавага ўезду ў Беларусь для замежнікаў. «Гэта не выключана», — адзначыў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства, адказваючы на пытанне пра перспектывы бязвізавага знаходжання ў 90 дзён. Ён нагадаў, што з шэрагам краін у Беларусі заключаны пагадненні аб бязвізавым уездзе на 30 дзён. У іх ліку Ізраіль, ААЭ, Катар і іншыя.**

Цяпер беларускі бок працуе над павелічэннем бязвізавага ўезду ў Беларусь да 10 дзён. «А ў перспектыве, можа быць, і да большага тэрміну», — дадаў Уладзімір Макей. Міністр падкрэсліў, што Беларусь як транзітная краіна з экспартна арыентаванай эканомікай кроўна зацікаўлена ў тым, каб зрабіць візавы рэжым максімальна прывабным для замежных грамадзян. «Мы зацікаўлены ў тым, каб да нас прыязджалі турысты, бізнесмены, каб яны маглі знаёміцца з бізнес-кліматам у краіне і праводзіць адпаведныя перамовы», — сказаў ён.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*


**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**

**по объекту: «Группа многоквартирных жилых домов с объектами социально-гарантированного обслуживания населения и общежитие в районе пересечения ул. Выготского, Проектируемой № 3 в г. Минске». Жилой дом №2 по генплану**

**Сведения о застройщике.**

Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» решением Мингорисполкома №2292 от 18.11.2004 зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №190580566. **Юридический адрес**: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет Застройщиком построены и введены в эксплуатацию объекты:

– жилой дом №20 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 40 месяцев;

– жилой дом №12 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 24 месяца;

– жилой дом №14 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 47 месяцев;

– жилой дом №8 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 15 месяцев;

– жилой дом №10 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 13 месяцев;

– жилой дом №16 по ул. Мястровская, фактический срок строительства – 20 месяцев;

– жилой дом №29 по ул. Мястровская, фактический срок строительства – 18 месяцев;

– жилой дом №3А по ул. Нововиленская, фактический срок строительства – 7 месяцев;

– жилой дом №7Б по ул. Нововиленская, фактический срок строительства – 9 месяцев;

– малоэтажные жилые по ул. Зацень 45А, 45Б, 45В, фактический срок строительства – 5 месяцев;

– жилой дом №123 по пр. Победителей, фактический срок строительства – 27 месяцев;

– жилой дом №37А по ул. Каховская, фактический срок строительства – 52 месяца;

– жилой дом №121 по пр. Победителей, фактический срок строительства – 18 месяцев;

– жилой дом №15 по ул. Павлины Меделки, фактический срок строительства – 9 месяцев;

– жилой дом №5 по ул. Павлины Меделки, фактический срок строительства – 10 месяцев;

– жилой дом №20 по ул. Выготского, фактический срок строительства – 12 месяцев.

Цель строительства многоквартирного жилого дома общей площадью 8466,95 кв. м, в том числе общей площадью квартир – 6851,58 кв. м – увеличение уровня обеспеченности населения жильем.

Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

Начало строительства объекта – август 2017.

Окончание строительства объекта согласно ПОС (7,3 мес.) – март 2018.

По проектно-сметной документации получено положительное заключение РУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» от 06.04.2016 г. №74-15/16, от 06.07.2017 г. №350-15/17.

Земельный участок передан Государственному предприятию «УКС Центрального района» решением Мингорисполкома от 16.05.2016 г. №1343.

Получено разрешение Госстройнадзора от 04.08.2017 г., от 17.08.2017 г., от 14.11.2017 г. №2-209Ж-021/17.

Генеральный подрядчик – ОАО «МАПИД» (договор генподряда от 27.07.2017 г. №27.07/17).

В коммунальную собственность г. Минска для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство, безвозмездно передается 6,7% общей площади жилого дома.

Объект «Группа многоквартирных жилых домов с объектами социально-гарантированного обслуживания населения и общежитие в районе пересечения ул. Выготского, Проектируемой №3 в г. Минске». Жилой дом №2 по генплану запроектирован 3-секционным 9-этажным. В каждой секции предусмотрен лифт, мусоропровод.

Проектом предусмотрено техническое подполье и теплый технический чердак. В техподполье предусмотрены тепловой пункт и водомерный узел. На 1-м этаже запроектирована встроенная электрощитовая. 1–9 этажи занимают квартиры: всего – 132 квартиры, в том числе однокомнатных – 75 шт., двухкомнатных – 57 шт. Все квартиры имеют летние помещения (остекленные и неостекленные лоджии (балконы)).

Конструкция здания – с применением сборных железобетонных изделий серии М464М-9. Фундаменты запроектированы сборные ленточные. Стены внутренние – сборные железобетонные панели толщиной 160 мм. Стены наружные предусмотрены в изделиях серии М464М-9 из железобетонных трехслойных панелей толщиной 350 мм с утеплением из плит полистирольных ППТПТ-35 тол. 200 мм. Перекрытия из сборных железобетонных плит из тяжелого бетона толщиной 160 мм. Кровля плоская с внутренним водостоком, двухслойная; наклонная – металлопрофиль. Наружная отделка – фактурное покрытие защитно-декоративное стен; декоративные элементы, покрытия скатных участков кровли, козырьков, завершения лоджий – профнастил кровельный. Окна – из профилей ПВХ. Остекление лоджий из профилей ПВХ, остекление – стекло. Нижняя часть элементов остекления лоджий предусмотрена из сендвичпанелей. В некоторых квартирах предусмотрен совмещенный санузел. Входы в жилое здание осуществляются по крыльцам, оборудованным специальной подъемной платформой для инвалидов.

Внутренняя отделка предусматривает подготовку под чистовую отделку.

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается 39 квартир без выполнения внутренних отделочных работ, из которых:**

**1. 10 (десять) квартир, расположенных на 5-м и 6-м этажах, в том числе:**

– 5 (пять) 1-комнатных общей площадью от 40,35 $м^2$ до 42,28 $м^2$, стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном 770 долларам США,

– 5 (пять) 2-комнатных общей площадью от 63,79 $м^2$ до 67,75 $м^2$, стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном 740 долларам США.

Оплата производится единовременным платежом **–** 100% стоимости объекта долевого строительства – в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе.

**2. 20 (двадцать) квартир, расположенных на 2, 3 и 8-м этажах, в том числе:**

– 13 (тринадцать) 1-комнатных общей площадью от 40,35 $м^2$ до 42,28 $м^2$, стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном 710 долларам США,

– 7 (семь) 2-комнатных общей площадью от 63,79 $м^2$ до 67,75 $м^2$, стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном 680 долларам США.

Оплата производится единовременным платежом **–** 100% стоимости объекта долевого строительства – в течение 10 (десяти) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе.

**3. 9 (девять) квартир, расположенных на 1-м и 9-м этажах, в том числе:**

– 1 (одна) 1-комнатная общей площадью 40,35 $м^2$, стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном 650 долларам США,

– 8 (восемь) 2-комнатных общей площадью от 59,59 $м^2$ до 67,75 $м^2$, стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном 620 долларам США.

Оплата производится единовременным платежом – 100% стоимости объекта долевого строительства – в течение 3 (трех) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе.

Обязательство дольщика по уплате цены объекта долевого строительства (цены договора) исполняется в белорусских рублях в сумме, эквивалентной долларам США. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком на день платежа на специальный и расчетный счета застройщика.

**При подаче заявления и заключении договора с гражданином, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, необходимо** личное присутствие гражданина или его представителя, наличие паспорта и копии паспорта или доверенности и копии доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке, в которой должно быть предусмотрено право на представление интересов по всем вопросам, связанным с участием в долевом строительстве квартиры, в том числе правом подачи заявлений, справок, подписания необходимых документов.

Документы для подачи заявлений и заключения договоров будут приниматься **с 19 декабря 2017 года по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 7.**

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных помещений.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве считается неподанным и застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное помещение с другим претендентом.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента заключения договоров создания объекта долевого строительства на все количество продекларированных помещений.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно по адресу: **г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7, каб. 111, тел. 306-07-26**

# Папярэднія заслугі не маюць значэння?



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На думку Святланы Шапаравай, персанал на рынак не выходзіць, бо адчувае сябе дастаткова камфортна на тым месцы, дзе працуе. Але работадаўцам ужо крыху не хапае кадраў. Мяркуецца, што пасля прыняцця Дэкрэта №7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва» бізнес будзе і далей пашырацца, а значыць, рынкам стане кіраваць саіскальнік.

У галінах, дзе ёсць канкурэнцыя за спецыялістаў, неабходным мінімумам становіцца сацыяльны пакет. Кампаніі стараюцца рабіць яго больш сегментаваным з улікам патрэб супрацоўнікаў. Ёсць цікавы прыклад у Расіі, калі ў адным з банкаў работнікам аплачвалі медыцынскае абслугоўванне, шпіталізацыю ў дарагія клінікі, але, паколькі асноўную частку калектыву складала актыўная моладзь, гэта не было папулярна. Як толькі ў сацпакет уключылі страхоўку пры падарожжах, зніжкі на білеты і гатэлі, адразу вырас прыток патрэбных спецыялістаў.

Дарэчы, кампаніі, якія стварылі найлепшыя праекты для сваіх супрацоўнікаў, былі адзначаны на штогадовай «Прэміі HR-брэнд Беларусь — 2017». Пераможцамі ў розных намінацыях сталі прадпрыемствы «Дыском» (Caparol), Wargaming, «Газпрамнафта-Белнафтапрадукт», «ІзіШтандарт».

Беларускія работнікі, трэба сказаць, цікавыя і замежным наймальнікам. Нашы спецыялісты лічацца працалюбівымі і талерантнымі (гэта важна, бо часта даводзіцца працаваць у шматнацыянальнай камандзе). Але ёсць і мінус: беларусам патрэбна больш часу, каб адаптавацца, уключыцца ў новы праект.

## Прагнозы імавернасці звальнення і пяціхвілінныя ўрокі

**представителем юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

**представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь** – нотариально удостоверенная доверенность;

**представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя** – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе (назначение платежа – задаток для участия в аукционе от 17.01.2018).

Торги проводит аукционист, определяемый организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с Положением.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель аукциона (единственный участник торгов) в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации под подпись.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона (единственным участником торгов) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 15 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся **17 января 2018 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов на участие в аукционе, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 18.12.2017 по 15.01.2018 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-40-22, 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (8029) 936-76 -36, (8029) 528-85-82, (0163) 41-26-78 (государственное учреждение «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных сил»).

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15.

## Тры найлепшыя расліны супраць прастуды



• **Алоэ.** Гэта ўнікальная расліна прысутнічае практычна ў кожным доме, аднак пра яе гаючыя ўласцівасці часта забываюць. Альяс валодае выдатным біястымулюючым дзеяннем, нават умацоўвае імунітэт. Ад прастуды дапаможа наступны сродак: палову шклянкі грэцкіх арэхаў, цэлы лімон, пяць сталовых лыжак мёду і чатыры лісты альясу — здрабніць і змяшаць. Прымаць па адной чайнай лыжцы пасля яды.



• **Каланхоэ.** Гэта расліна здольная надзвычай хутка ліквідаваць непрыемныя сімптомы грыпу і іншых хвароб. Яна таксама валодае ўнікальным біястымулюючым дзеяннем. Пры насмарку трэба закапаць у нос некалькі кропель соку каланхоэ, пасля чаго хворы пачне чхаць. Гэта спрые хуткаму ачышчэнню насавых пазух ад слізі і палягчэнню дыхання.



• **Эўкаліпт.** Адна з самых эфектыўных раслін пры прастудзе. Пазбавіцца ад насмарку дапамока нават простае ўдыханне водару эўкаліпта, а самы эфектыўны метад — інгаляцыя з эўкаліптам. Акрамя ўсяго іншага, гэту расліну выкарыстоўваюць для лячэння кашлю і ў прафілактычных мэтах.

## ПЯЦЬ СПОСАБАЎ ПРЫМЯНЕННЯ СПІТАГА ЧАЮ Ў САДЗЕ І АГАРОДЗЕ

Калі вы не адмаўляеце сабе ў кубку духмянага чаю кожны дзень, за зіму ў вас назапасіцца нядрэнная колькасць заваркі, якую можна будзе выкарыстоўваць на ўчастку ў наступным сезоне.

Чайная заварка — універсальны прадукт для агарода. Яе можна выкарыстоўваць і для падрыхтоўкі зямлі да пасадкі, і для вырошчвання расады, і для падкорму раслін, і для іх мульчыравання. Раскажам, як зрабіць гэта правільна.

### 1. Кампост

Самы просты спосаб максімальна эфектыўна выкарыстоўваць спітую чайную заварку — дадаваць яе ў кампоставую кучу. Чай узбагаціць кампост карыснымі для раслін элементамі. У прыватнасці, спітая заварка — натуральная крыніца азоту.

Акрамя таго, лісце чаю за кошт дубільных рэчываў, якія ў ім змяшчаюцца, актывізуюць працэсы раскладання, а гэта значыць, што кампост перапрэе хутчэй.

Перад тым як дадаць чайнае лісце ў кампоставую кучу, абавязкова пераканайцеся, што пакецік і бірка не ўтрымліваюць сінтэтычных элементаў, якія не перапрацоўваюцца мікраарганізмамі. Такія матэрыялы звычайна гладкія навобмацак, і збліпаюцца з паперай складана. Калі чайны пакецік штучны, перад кампаставаннем выдаліце яго.

### 2. Угнаенне

Выкарыстоўвайце чайнае лісце як экалагічна бяспечнае ўгнаенне можна ў любой фазе росту раслін. Уносіць такія чайныя падкормкі вельмі проста — дастаткова прыкапаць іх у верхнім пласце глебы ў прыствольных кругах. Пастуова раскладаючыся, угнаенне будзе насычаць глебу азотам.

Вялікі плюс такога ўгнаення ў тым, што яно валодае пралангаваным дзеяннем і аддае элементы паступова.

Калі вы плануеце ўносіць заварку пад пасадку, папярэдне яе рэкамендуецца высушыць. Высушаны спіты чай можна засыпаць проста ў лункі.

Калі вы п'яце чай з цукрам, перад выкарыстаннем такой заваркі, яе неабходна прамыць. У адваротным выпадку, на «салодзенькае» спаўзуцца мурашы.

Таксама выкарыстанымі гарбатнымі пакецікамі нядрэнна праціраць пакаёвыя расліны. Так вы не толькі акуратна ачысціце лісце ад пылу, але і падкорміце кветкі.

### 3. Таблеткі для расады

Выкарыстаныя гарбатныя пакецікі цалкам могуць паслужыць годнай альтэрнатывай тарфяным таблеткам для вырошчвання расады.

Дастаткова ўскрыць верх пакеціка, дасыпаць зверху пласт універсальнага глебагрунту для расады і пасеяць туды насенне. Калі з'явяцца ўсходы, і сеянцы дасягнуць фазы пікіроўкі, іх можна перасаджваць у збанкі або адкрыты грунт проста ў чайным пакеціку.

Заварка будзе служыць добрым угнаеннем. Акрамя таго, такая перасадка не пашкодзіць карані маладой расліны. Для некаторых культур (напрыклад, для перцу) гэта сапраўднае выратаванне, бо яны хваравіта рэагуюць на пікіроўку.



### 4. Паляпшальнікі глебы

Спіты чай (асабліва ліставы) — даступны, танны і экалагічны сродак для паляпшэння структуры глебы. Заварка робіць глебагрунт больш друзлым, а значыць, паветра- і вільгацепранікальным.

Рэкамендуецца дадаваць лісце гарбаты з разліку 0,5 кг на 1 квадратны метр. Калі вы чайны «фанат», за зіму сцалкам рэальна назапасіць спітай заваркі хоць бы на адну-другую градку або кветнік.

### 5. Мульча

Чайнае лісце будзе затрымліваць вільгаць і, паступова раскладаючыся, падтрымліваць «жыццё» ў верхнім слоі глебы.

Акрамя таго, чайная мульча прыгнятае рост пустазелля — палоць градкі давядзецца радзей.

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.20 | 16.47 | 7.27 |
| Віцебск — | 9.17 | 16.29 | 7.12 |
| Магілёў — | 9.10 | 16.37 | 7.27 |
| Гомель — | 8.58 | 16.42 | 7.44 |
| Гродна — | 9.34 | 17.04 | 7.30 |
| Брэст — | 9.26 | 17.13 | 7.47 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 10 снежня.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

**Імяніны**

*Пр.* Андрэя Першазванага.
*К.* Люцыі, Юліі, Пятра, Уладзіміра.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# ЗАЎТРА





## Даты Падзеі Людзі

### 13 СНЕЖНЯ

**1105** год — адбылася хіратонія ў полацкія епіскапы Міны Полацкага. Гэта адзін з першых полацкіх іерархаў, пра каго маецца дата ванае летапіснае сведчанне. Верагодна, пры яго ўдзеле выхоўвалася і Ефрасіння Полацкая. Міна Полацкі ўшаноўваецца праваслаўнай царквой як адзін з архіпастыраў, якія садзейнічалі распаўсюджванню хрысціянства ў Беларусі.

**1642** год — галандскі мараплавец Абель Тасман упершыню ступіў на зямлю Новай Зеландыі. Другім еўрапейцам, які наведаў астравы, стаў Джэймс Кук. Члены яго экспедыцыі высадзіліся на бераг Новай Зеландыі восенню 1769 года. Мараплавец абвясціў гэтыя землі ўласнасцю караля Георга III і нанёс на карту іх берагавую лінію. За ім у 90-я гады XVIII стагоддзя рушылі ўслед кітабоі і паляўнічыя на цюленяў, а ў 1814 годзе з'явіліся першыя хрысціянскія місіянеры. 6 лютага 1840 года правадыры мясцовага племя маары ў паселішчы на рацэ Вайтанга падпісалі з Вялікабрытаніяй дагавор, паводле якога яны саступалі англійскай каралеве «ўсе правы і паўнамоцтвы суверэнітэту».

**1797** год — 220 гадоў таму нарадзіўся Генрых Гейнэ, нямецкі паэт, публіцыст і літаратурны крытык.



Французская акупацыя ўнесла ў атмасферу раздробненай Германіі прагрэсіўныя ідэі, у тым ліку новыя прынцыпы грамадзянскай і рэлігійнай роўнасці, якія на ўсё жыццё зрабілі Гейнэ лібералам у традыцыях Французскай рэвалюцыі.

**1902** год — нарадзіўся Яўгеній Пятроў (Яўгеній Пятровіч Катаеў), рускі савецкі пісьменнік, журналіст, сцэнарыст, суаўтар Ілы Ільфа, з якім напісаў раманы «Дванаццаць крэслаў» і «Залатое цяля». У гады Вялікай Айчыннай вайны — франтавы карэспандэнт. Загінуў у авіякатастрофе ў 1942 годзе.

**1920** год — на II Усебеларускім з'ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў прыняты дапаўненні да Канстытуцыі ССРБ 1919 года і ратыфікаваны дагавор паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. З'езд выказаўся за пераклад усіх дзяржаўных устаноў на беларускую мову.

**Было сказана**

**Сяргей ГРАХОЎСКІ, паэт, публіцыст:**

*«Жыццё пражыць —*
*Не поле перайсці,*
*А трэба і жыццё*
*Прайсці, як поле,*
*І хоць адным зярняткам узысці,*
*А бур'яном не зарасці ніколі».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Ён есць — ты гатуеш, ён носіць — ты мыеш, ён раскідвае — ты прыбіраеш. І што б ты без яго рабіла?**

— Доктар, як прайшла аперацыя?

— Яшчэ ніяк, але калі ўжо вы не спіце, прытрымайце сціскачом вось тут.

**...Яна сцягнула з сябе ніжнюю бялізну, чым нанесла пацярпеламу цяжкую маральную траўму, несумяшчальную з сексам.**

Грэшнік у пекле:

— Чаму мяне другі год смажаць на адным і тым жа алеі?!

— Таму што ты гандляваў бульбай-фры!

**Фотафініш паказаў, што першай фінішнай стужкі кранулася грудзьмі бягуха з Бразіліі, якая дагэтуль адставала ад лідара на 20 сантыметраў.**

— Пятровіч, што, кажуць, ты на пенсію сабраўся?

— Так, хачу больш часу праводзіць з сям'ёй.

— А яна згодная?

**Вегетарыянства шкоднае для здаровага ладу жыцця.**

**Хто не згодзен — пачытайце, за што Адам і Ева былі выгнаныя з раю.**





Малюнак Уладзіміра ЧУГЛАЗАВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4734.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 12 снежня 2017 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

13 снежня 2017 г. №47 (431)




стар. 5

Бюджэт вам у дапамогу



стар. 4

У вёску — па прычоску



стар. 7

Хто будзе без дазволу?

ТЭМА ТЫДНЯ

## ЗАМЕСТ «СПАТКАННЯ» — «ЛЕПІМ САМІ»

### Аб'екты грамадскага харчавання і гандлю пераводзяць у новы фармат



Работнікі бара «Ежа&Кава» прапануюць да 24 відаў кавы.

За апошнія чатыры гады Міншчына зрабіла значны рывок у сферы бытавога абслугоўвання насельніцтва. І цяпер цэнтральны рэгіён наперадзе ўсіх абласцей па відах і аб'ёмах рэалізацыі бытавых паслуг. Шмат новага з'явілася і ў галіне спажывецкай кааперацыі. У прыватнасці, памянялася канцэпцыя работы гандлёвых аб'ектаў, у многіх райцэнтрах адкрыліся закусачныя «Лепім самі», у новым фармаце працуюць аб'екты прыдарожнага сэрвісу. Тон у навацыях задае Слуцкі раён. Туды і накіравалася наша карэспандэнт, каб усё пабачыць на свае вочы. стар. 4

УСЁ Ў ПАРАДКУ

## З ВІДАМ НА ЎТУЛЬНЫ ДВОР

### Карэспандэнт «МС» высвятляла сакрэты добраўпарадкавання магілёўскіх дворыкаў

**У Магілёўскім гарсавеце нядаўна дэпутаты вызначаліся з найлепшымі дварамі і пад'ездамі ў межах агляду-конкурсу па добраўпарадкаванні за гэты год. Спрэчкі вяліся не абы якія. Шмат добрых слоў прагучала ў адрас агульнага дворыка для дамоў 23, 25, 27 па вуліцы Якубоўскага. Ён стаў адным з прэтэндэнтаў на прызавое месца. Тут, адзначалі народныя абраннікі, вельмі добра выкарыстоўваецца і адміністрацыйны рэсурс, і работа з насельніцтвам. Стала цікава, ці сапраўды там так добра, як расказваюць, — вырашыла схадзіць паглядзець.**

#### ПРЫГАЖОСЦЬ СВАІМІ РУКАМІ

Яшчэ здалёк убачыла маляўнічую пляцоўку з сучасным гульнявым абсталяваннем і некалькі маладых жанчын з дзецьмі. Пазнаёміліся бліжэй: Каця, Наташа і дзяўчына з прыгожым прыбалтыйскім імем Легіта. Усе яны з суседніх дамоў, а Легіта нават з суседняй вуліцы. Пакуль малыя гуляюць, гутарым пра ўтульныя двары. Мікрараёну Мір-2, лічаць яны, пашчасціла. Хай такая прыгажосць і не ў кожным двары, але ж у радыусе дасягальнасці. Дзецям тут сапраўды цікава — прасторныя пляцоўкі, сучаснае абсталяванне, казачныя героі.

Парадак на тэрыторыі падтрымлівае ЖЭУ №6. Яго начальнік Маргарыта Цітова, дарэчы, сама дэпутат гарсавета, а па сумяшчальніцтве намеснік старшыні Савета тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання мікразоны №6. У гэтым ЖЭУ Маргарыта Аляксееўна працуе ўжо 14 гадоў, ведае тут кожнае дрэўца. Прызнаецца, што багаты вопыт дае ёй магчымасць аператыўна вырашаць усе пытанні. стар. 8



Дворык на вуліцы Якубоўскага прыцягвае нават жыхароў з іншых вуліц.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## ДЭБАТЫ — ПА-ЗА ПАСЯДЖЭННЯМІ

*Ці адбываюцца ў парламенце гарачыя спрэчкі?*



**Як расказала намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна ШЧОТКІНА на сустрэчы са слухачамі Інстытута дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, айчынныя парламентарыі вядуць сур'ёзныя дэбаты не на саміх пасяджэннях, а ў міжсесійны перыяд.**

— Часам задаюць пытанне: «А чаму ў нас няма гарачых дэбатаў»? Ведаеце, для гэтага ў нас ёсць міжсесійны перыяд, калі прапрацоўваюцца ўсе законапраекты, — адзначыла Мар'яна Шчоткіна. — Калі людзі прыходзяць у залу, дзе адбываецца галасаванне, яны ўжо маюць выпрацаваную пазіцыю. Яны ўжо прайшлі ўсе гэтыя бататалі і сфарміравалі свой пункт гледжання.

На мерапрыемстве намеснік старшыні Савета Рэспублікі расказала слухачам Інстытута дзяржаўнай службы, як ажыццяўляецца падрыхтоўка законапраектаў, а таксама аб супрацоўніцтве паміж Саветам Рэспублікі і Палатай прадстаўнікоў. Асобна яна звярнула ўвагу на такія аспекты, як выпрацоўка актуальных прапаноў для вырашэння важных дзяржаўных пытанняў, дзейнасць на міжнароднай арэне і работа са зваротамі грамадзян.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

## ПАД ЛЯЖАЧЫ КАМЕНЬ ВАДА НЕ ЦЯЧЭ

*Па ініцыятыве верхняй палаты парламента абмяркавалі работу Беларуска-кітайскага індустрыяльнага парка*

**У гасцініцы «Пекін» другі раз у гэтым годзе адбыўся круглы стол па пытаннях пашырэння беларуска–кітайскага супрацоўніцтва, арганізаваны Пастаяннай камісіяй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы ва ўзаемадзеянні з пасольствам Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь.**

Мадэратарамі мерапрыемства выступілі старшыня названай камісіі Сяргей Рахманаў, дырэктар рэспубліканскага Інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя Анатоль Тозік, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Рэспубліцы Беларусь Цуй Цымін і галоўны выканаўчы дырэктар Кампаніі па развіцці індустрыяльнага парка Ху Чжэн. У рабоце круглага стала таксама прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрстваў эканомікі, архітэктуры і будаўніцтва, адукацыі, Нацыянальнага банка, Дзяржаўнага мытнага камітэта, Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі.

Былі разгледжаны пытанні, звязаныя з рэалізацыяй палажэнняў Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 мая 2017 г. №166 «Аб удасканаленні спецыяльнага прававога рэжыму Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень», вядзеннем бізнесу ў нашай краіне, а таксама правапрымяняльнай практыкай гэтага ўказа.

## ВЫРАШЭННЕ САПРАЎДНЫХ ПРАБЛЕМ

*Член Прэзідыума Савета Рэспублікі правяла асабісты прыём грамадзян*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, намеснік старшыні Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па заканадаўстве і рэгламенце Ала БОДАК прыняла ўдзел у пасяджэнні Камісіі Парламенцкага сходу па інфармацыйнай палітыцы.**

На пасяджэнні быў разгледжаны ход падрыхтоўкі праекта дэкрэта Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы «Аб бюджэце Саюзнай дзяржавы на 2018 год», у тым ліку магчымасць фінансавання ў рамках Саюзнай дзяржавы развіцця інфраструктуры адукацыйнага працэсу і навуковых даследаванняў Беларуска-Расійскага ўніверсітэта ў Магілёве. Акрамя таго, парламентарыі абмеркавалі праекты рэкамендацый парламенцкіх слуханняў «Збліжэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі па пытаннях забеспячэння роўных правоў грамадзян Саюзнай дзяржавы» і палажэння аб Маладзёжнай палаце пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі.

Акрамя таго, старшыня Пастаяннай камісіі правяла ў Савеце Рэспублікі асабісты прыём грамадзян. У прыватнасці, падчас яго жыхар вёскі Красны Беражок Вілейскага раёна Мінскай вобласці звярнуўся з просьбай: аказаць садзейнічанне пры афармленні дакументаў у сувязі з падзелам жылога дома і вызначэннем парадку карыстання зямельным участкам. Заяўніку было растлумачана, што вырашэнне ўзнятага пытання магчыма па ўзаемнай згодзе ўласнікаў жылога дома. Паколькі пытанні, якія датычацца дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй, адносяцца да кампетэнцыі Нацыянальнага кадастравага агенцтва, да іх вырашэння мэтазгодна прыцягнуць экспертаў гэтай арганізацыі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

ВЫБАРЫ-2018

# КАНДЫДАТЫ ЎЖО ВЫЛУЧАЮЦЦА

### Па выніках выбараў дэпутацкі корпус атрымае новае аблічча

**Такое меркаванне выказала старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА пасля пасяджэння Цэнтрвыбаркама.**



Фота БЕЛТА.

— Ажыццяўляецца звычайная работа, але я магу сказаць, што, мяркуючы па колькасці запытаў, якія высвятляюць канкрэтныя дэталі выбарчай кампаніі, цікавасць ёсць, — адзначыла Лідзія Ярмошына. — Гэтыя людзі не належаць да фармальнай, наменклатурнай супольнасці. Гэта зусім новыя асобы, прадпрымальнікі, паколькі тое ж пытанне дэкларавання датычыцца іх напрамую. Таму я думаю, што дэпутацкі корпус, калі гэтыя людзі абяруцца, зменіцца.

## Пра выступленні на радыё

Кандыдаты ў дэпутаты маюць законнае права на адно бясплатнае выступленне па радыё. Як расказала **загадчык аддзела прававой, аналітычнай і метадычнай работы Цэнтральнай выбарчай камісіі Галіна МКРТЫЧАН,** такія выступленні будуць доўжыцца не менш за тры хвіліны. На яе думку, гэтага дастаткова, каб расказаць і пра сябе, і пра свае планы.

Сфарміраваны і парадак выступленняў. Кандыдаты ў дэпутаты Мінскага гарсавета выступяць у эфіры «Радыё-Мінск», Мінскага абласнога Савета — у эфіры «Мінскай хвалі».

Заявы кандыдатаў у дэпутаты рай- і гарсаветаў, абласных гарадоў будуць трансліявацца на тых радыёпраграмах, заснавальнікамі якіх з'яўляюцца адпаведныя органы ўлады. Калі такіх няма — то ў эфіры абласных тэлерадыёкампаній. Выключэнне — Жодзінскі гарадскі Савет дэпутатаў. Калі няма такіх раённых і гарадскіх праграм, то заявы іх кандыдатаў у дэпутаты прагучаць на «Мінскай хвалі».

## Пра дыскусіі ў СМІ

Пры Цэнтральнай выбарчай камісіі створаны «Кансультатыўны савет па разглядзе спрэчак, якія звязаны з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі пры правядзенні выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў 28-га склікання». Упершыню такі орган быў створаны яшчэ ў 2000 годзе, аднак ва ўсе папярэднія кампаніі ён збярэцца па-рознаму.

Кіраўніком савета стаў першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар Луцкі, а ў склад увайшлі прадстаўнікі СМІ і спецыялісты ў гэтай галіне. Адзначым, што ўзнагароджанне ўдзельнікам камісіі не прадугледжана — яны працуюць добраахвотна.

## Пра зацвярджэнне выбарчага фонду

Было зацверджана палажэнне, якое вызначае парадак фарміравання і расходавання грошай выбарчага фонду кандыдата ў дэпутаты. Крыніцамі фарміравання такога фонду могуць быць уласныя зберажэнні, лімітаваны памер якіх не можа перавышаць 30 базавых велічынь для кандыдата ў дэпутаты абласнога, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і 10 базавых — для кандыдатаў у дэпутаты раённага, гарадскога, горада-абласнога і раённага падпарадкавання, пасялковага і сельскага Саветаў дэпутатаў. Другая крыніца — добраахвотныя ахвяраванні, памер якіх не можа перавышаць 2 базавыя велічыні ад аднаго грамадзяніна. Трэцяя крыніца — ахвяраванні юрыдычных асоб, якія не могуць быць больш за 5 базавых.

## Пра дэкларацыі

Кандыдаты ў дэпутаты на выбарах у мясцовыя Саветы 28-га склікання павінны будуць падаць дэкларацыю аб даходах за 2016 год, а не за 2017-ы. На пасяджэнні адзначалася, што ў камісію часта звяртаюцца з просьбамі растлумачыць правілы дэкларавання даходаў і маёмасці тымі людзьмі, якія вылучаюцца ў дэпутаты.

Прычыны такога рашэння наступныя. Па-першае, вылучэнне кандыдатаў для ўдзелу ў мясцовых выбарах пачалося ў гэтым месяцы і заканчваецца 8 студзеня 2018 года. Па-другое, многія грамадзяне атрымліваюць заробатную плату за снежань толькі ў сярэдзіне студзеня, акрамя таго, многія атрымліваюць узнагароджанне за год, якое таксама выплачваецца пасля 1 студзеня. Гэта значыць, што на момант аддачы дэкларацыі кандыдаты могуць не бачыць гэтых сродкаў, а ўжо пры праверцы гэтая розніца будзе бачная.

Прадугледжана, што выбарчыя камісіі будуць адпраўляць запыты ў падатковыя органы, ДАІ, Нацыянальнае кадастравае агенцтва і іншыя структуры. У выпадку парушэння правілаў дэкларацыі можа ўзнікнуць падстава для адмовы ў рэгістрацыі кандыдата.

* * *

Арганізаваны першыя пікеты па зборы подпісаў па вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты.

Так, актыўна ўключылася ў выбарчую кампанію Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь», якое яшчэ 10 снежня выставіла першыя пікеты ў Мінску. Актывісты арганізацыі размясцілі спецыяльныя пляцоўкі ў Маскоўскім, Ленінскім, Першамайскім і Фрунзенскім раёнах. Дарэчы, «Белая Русь» не толькі вылучае сваіх прадстаўнікоў у склад выбарчых камісій у якасці назіральнікаў, але і аказвае ўсебаковую падтрымку членам аб'яднання, якія вылучаюцца ў якасці кандыдатаў.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

АНОНС

# У ХУТКІМ ЧАСЕ — СЛУХАННІ

### Яны адбудуцца менш чым праз тыдзень



**У Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу 19 снежня пройдуць адкрытыя парламенцкія слуханні «Партнёрства галін улады як неабходная ўмова паспяховага дасягнення Мэт устойлівага развіцця».**

У мерапрыемстве возьмуць удзел больш за 100 чалавек — члены Савета Рэспублікі, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, члены Савета па ўстойлівым развіцці, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, грамадскіх арганізацый. Ключавой тэмай для абмеркавання стане рэалізацыя Мэт устойлівага развіцця (МУР) у эканамічнай, экалагічнай і сацыяльнай сферах краіны, у тым ліку за кошт механізмаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Будуць абмеркаваны ўмовы ўкаранення паказчыкаў МУР, дзяржаўныя праграмы рознага ўзроўню. Асаблівую ўвагу плануецца ўдзяліць ролі парламента ў дасягненні МУР, удасканаленню нарматыўнай прававой базы для выбудоўвання эфектыўнай работы па іх дасягненні.

Па выніках парламенцкіх слуханняў будуць вызначаны прыярытэтныя напрамкі далейшай дзейнасці па дасягненні Мэт устойлівага развіцця ў Беларусі, падрыхтаваны адпаведныя рэкамендацыі дзяржаўным органам і зацікаўленым арганізацыям і аб'яднанням.

Акрамя таго, на гэтым тыдні падчас пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі было прынята рашэнне аб стварэнні рабочай групы Нацыянальнага сходу па дасягненні Рэспублікай Беларусь Мэт устойлівага развіцця. Узначаліла групу старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ала Бодак, яе намеснікам стаў Валерый Барадзеня, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па бюджэце і фінансах.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

ПРАГНОЗ НА ЗАЎТРА



# Бюджэтны варыянт. Пасыл для ўпэўненасці

## Якім будзе галоўны гадавы фінансавы дакумент краіны?

**Ад кожнага зробленага намі кроку, прынятага рашэння залежыць (хай гэта і не адразу заўважна), як змяняецца наша жыццё — цяпер, праз пару гадоў ці дзесяцігоддзе. Так і ў выпадку з бюджэтам: ад таго, як ён будзе складзены і выкананы, залежыць вырашэнне задач па праграмах развіцця краіны на пяцігоддзе і далей. Пра асаблівасці законапраекта рэспубліканскага бюджэту на наступны год «МС» расказаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ.**



### Вырашэнне сацыяльных задач

«Пагадзіцеся, якасць і ўзровень жыцця насельніцтва краіны шмат у чым вызначаюцца той бюджэтнай палітыкай, якая ў ёй праводзіцца. Задача парламентарыяў разам з урадам праз бюджэтную палітыку падтрымліваць гарантаваны ўзровень жыццезабеспячэння насельніцтва і абавязкова дапамагаць сацыяльна неабароненым групам», — кажа Уладзімір Панцюхоў.

Ужо вядома, што праект рэспубліканскага бюджэту на 2018 год распрацаваны з кансерватыўнага сцэнарыя прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця. Даходы бюджэту на наступны год вызначаны ў суме 20,5 млрд рублёў (або з ростам да чаканага выканання ў адносінах да 2017-га на 7,8%), выдаткі — у суме 19,8 млрд рублёў або 107,0% да мінулага года. Паводле слоў парламентарыя, даходная частка бюджэту сфарміравана зыходзячы з дзеючых падаткаў. Падатковая нагрузка прагназуецца ў памеры не больш за 25,5% да ВУП і не перавысіць узровень, прадугледжаны ў праграмных дакументах.

«Асноўныя пазітыўныя моманты, якія варта адзначыць у праекце бюджэту на 2018 год, звязаныя пераважна з вырашэннем сацыяльных задач. Сацыяльная накіраванасць праяўляецца не толькі праз прамое фінансаванне сацыяльнай сферы (медыцыны, адукацыі, культуры, спорту), але і праз падтрымку сельскай гаспадаркі, транспартнай галіны, жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Канчатковай мэтай яе з'яўляецца зніжэнне коштаў на паслугі гэтых галін для насельніцтва, — тлумачыць сенатар. — У той жа час праект бюджэту на 2018-ы складана назваць бюджэтам развіцця ў поўным сэнсе, паколькі сацыяльныя выдаткі яўна пераважаюць. Таму асноўны фінансавы план краіны, па сутнасці, кансервуе бягучы стан эканомікі».

### Адна з перашкод — забюракратызаванасць

Па словах старшыні Пастаяннай камісіі, у краіне ёсць прыярытэтныя — спецыфічныя або «прарыўныя» — напрамкі, такія як унутраныя і знешнія інвестыцыі, лічбавыя тэхналогіі, АПК і перапрацоўчая прамысловасць, дзяржаўна-прыватнае партнёрства, якія могуць і павінны быць узятыя пад сенатарскую апеку. «Напрыклад, што датычыцца аграпрамысловага комплексу, то ключавая роля ва ўмацаванні фінансавага стану арганізацый АПК павінна належаць Агенцтву па кіраванні актывамі», — упэўнены Уладзімір Панцюхоў. У першую чаргу гэта датычыцца работы Агенцтва ў рамках дасудовага аздараўлення крэдытаатрымальнікаў, забеспячэння адтэрміноўкі ці растэрміноўкі на пагашэнне асноўнага доўгу па крэдытах і іх абслугоўванне.

«Альбо навука. Яна таксама патрабуе фінансаў і не толькі таму, што зараз у нас Год навукі, і не таму, што праходзіць II З'езд вучоных, які павінен стаць «плацдармам» для карэкціроўкі навуковай палітыкі ў краіне. У абгрунтаванні да праекта бюджэту ўрад паказвае, што дадатковай крыніцай фінансавання навуковай сферы будуць выступаць сродкі цэнтралізаванага і мясцовых інавацыйных фондаў. Аднак сёння працэнт асваення гэтых сродкаў нязначны. Лічбы кажуць самі за сябе», — падкрэслівае парламентарый.

На 1 снежня 2017 года выкананне гадавога плана па мясцовых інавацыйных фондах склала 24,1%, а рэспубліканскага цэнтралізаванага фонду — 42,6%. «Такая сітуацыя з вельмі невысокім узроўнем засваення сродкаў інавацыйных фондаў, што паўтараецца з году ў год, шмат у чым абумоўлена недасканаласцю існуючага алгарытму фарміравання і фінансавання інавацыйных праектаў. Працягласць працэдур узгаднення і розных экспертыз праектаў прыводзіць да таго, што іх рэалізацыя пачынаецца часта толькі ў III квартале года. Пры гэтым залішнія патрабаванні да праектаў, забюракратызаванасць працэсаў з боку Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях з'яўляюцца бар'ерамі для навукова-даследчых арганізацый, якія ў выніку адмаўляюцца ад удзелу ў праектах», — кажа сенатар. Можа быць, таму ў нас назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да зніжэння колькасці выдадзеных патэнтаў на вынаходкі — з 1474 у 2011-м да 941 у 2016-м.

### Моцныя дапамогуць слабым

Што датычыцца рэгіёнаў, то тут пазіцыя Уладзіміра Панцюхова непахісная: «Моцныя рэгіёны — моцная краіна, моцныя рэгіёны дапамогуць тым, хто слабейшы». Ён лічыць, што ў праекце бюджэту варта ўзмацніць механізмы стымулявання апераджальнага развіцця рэгіёнаў-донараў і падтрымкі рэгіёнаў-рэцыпіентаў. Падыходы па фарміраванні мясцовых бюджэтаў павінны забяспечваць збліжэнне фінансавых магчымасцяў мясцовых бюджэтаў і ствараць стымулы для развіцця рэгіёнаў.

Сёння за мясцовымі бюджэтамі ў поўным аб'ёме замацаваны такія эфектыўныя крыніцы даходаў, як падаходны падатак, падатак на ўласнасць, падатак на прыбытак, што выплачваецца прыватным бізнесам і камунальнымі прадпрыемствамі. Ім адлічваецца каля чвэрці рэспубліканскага падатку на дабаўленую вартасць. Але гэтага мала.

**У кіраўнікоў мясцовых органаў улады павінны быць гарантыі, што рост даходаў мясцовых бюджэтаў не абумовіць скарачэнне датацый з рэспубліканскага бюджэту. Кожны дадаткова зароблены рубель павінен застацца ў мясцовым бюджэце.**

«Пры фарміраванні бюджэту на 2018 год правы і свабоды мясцовых органаў улады ў распараджэнні сродкамі мясцовых бюджэтаў пашыраны. У прыватнасці, датацыі бюджэтам абласцей разлічаны без уліку дадатковых даходаў ад павышэння мясцовымі Саветамі дэпутатаў ставак падаткаў на ўласнасць і прыросту паступленняў падатку на прыбытак звыш зацверджанага на 2017 год памеру. Гэта дае мясцовым Саветам дэпутатаў магчымасць як зніжэння падатковай нагрузкі для арганізацый і грамадзян, так і нарошчвання даходаў бюджэту. Названыя падыходы патрабуюць далейшага развіцця. Нарошчванне ўласнай даходнай базы мясцовых бюджэтаў і развіццё падатковай аўтаноміі павінны стаць ключавымі прынцыпамі бюджэтнай палітыкі», — адзначае старшыня Пастаяннай камісіі.

### Лічбы выклікаюць асцярогу

— Непакояць лічбы, звязаныя з прамымі замежнымі інвестыцыямі. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сваім звароце да беларускага народа і Нацыянальнага сходу ў красавіку 2017 года назваў прыцягненне інвестыцый разам з нарошчваннем экспарту жыццёвай неабходнасцю. Таму час шукаць і знаходзіць інвестыцыі. Аднак статыстыка такая. З 2011 года доля інвестыцый у асноўны капітал і аб'ём прамых замежных інвестыцый у беларускую эканоміку скараціліся ў 1,6 раза. Актуальным пытаннем застаецца і якаснае змяненне структуры інвестыцый у асноўны капітал. Калі ў 2011 годзе доля машын і абсталявання ў тэхналагічнай структуры інвестыцый складала 45,3%, то ў 2016 годзе — 35,7% (першае паўгоддзе 2017-га — 36,7%), што абумоўлівае зніжэнне аддачы ад інвестыцый.

> Залішнія патрабаванні да праектаў, забюракратызаванасць працэсаў з боку Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях з'яўляюцца бар'ерамі для навукова-даследчых арганізацый.

**Шмат гаворыцца прыгожых слоў пра прывабныя ўмовы для інвестара, створаныя ў нашай краіне. І тут можна працытаваць кіраўніка дзяржавы: «Калі ўсе ўмовы створаны, то чаму аб'ёмы інвестыцый скарачаюцца? Дзе мы недапрацоўваем?» Чаму інвестыцыйны клімат у нас, на жаль, рэальна горшы, чым сітуацыя ў эканоміцы?**

Разуменне неабходнасці і важнасці інвестыцый, у тым ліку замежных, у рэальны сектар эканомікі ў дзяржаўных органаў сфарміраванае. Аднак сёння інвестыцыйны працэс мае ў большай ступені пасіўны характар. Перакананы, што такі падыход да працы з патэнцыяльнымі інвестарамі ў далейшым недапушчальны і наносіць шкоду інтарэсам дзяржавы.

Але я з аптымізмам гляджу ў будучыню. І веру, што распрацаваныя прагнозныя дакументы, улучаючы меры бюджэтнай палітыкі, дазволяць у 2018 годзе даць жыхарам Беларусі неабходныя пасылы для ўпэўненасці ў заўтрашнім дні.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# Налета рост ВУП на 2,1%

## Эксперты адзначаюць, што на фоне зніжэння інфляцыі працэнтныя стаўкі па крэдытах у нацыянальнай валюце скараціліся ўдвая

**Сусветны банк прагназуе рост ВУП Беларусі ў 2018 годзе на 2,1%, паведаміла эканаміст Сусветнага банка Марына СІДАРЭНКА падчас прэзентацыі чарговага «Эканамічнага агляду Сусветнага банка для Беларусі».**

А па выніках 2017 года прагназуецца рост ВУП у 1,8%. Марына Сідарэнка расказала аб тых рызыках пагаршэння кан'юнктуры ў Беларусі, якія бачыць Сусветны банк. «Папершае, для наступных плацяжоў па пагашэнні знешняга доўгу патрабуецца дарагое рэфінансаванне. Па-другое, краіна па-ранейшаму ўразлівая да валатыльнасці паставак сырой нафты з Расіі і ваганняў сусветных цэн на сыравінныя тавары», — падкрэсліла яна.

Спецыяліст Сусветнага банка таксама звярнула ўвагу, што ў апошні час урад праводзіць палітыку, накіраваную на падтрымку росту прыватнага сектара, аднак эфект ад такой палітыкі будзе атрыманы ў сярэднетэрміновай перспектыве. Марына Сідарэнка нагадала, што за дзесяць месяцаў 2017 года рост рэальнага ўнутранага валавога прадукту склаў 2%. «Умераны эканамічны рост у Расіі і паступовае павышэнне коштаў на сыравінныя тавары стымулявалі рост таварнага экспарту і спрыялі ажыўленню ўнутранай дзелавой актыўнасці, асабліва ў прамысловасці. Таксама адзначаецца станоўчая дынаміка ў сектары паслуг», — сказала яна. Акрамя таго, эксперт звярнула ўвагу на тое, што рост рэальнай заработнай платы спыніў падзенне даходаў хатніх гаспадарак — за дзевяць месяцаў года рэальныя наяўныя даходы выраслі на 0,4%.

«Жорсткая грашова-крэдытная і бюджэтна-падатковая палітыка садзейнічала зніжэнню інфляцыі да аднaзначнай велічыні, якая з'яўляецца самым нізкім паказчыкам за два дзесяцігоддзі. На фоне зніжэння інфляцыі Нацбанк амаль штомесяц паніжаў базавую працэнтную стаўку, так што яна скарацілася да 11%, у выніку чаго намінальныя працэнтныя стаўкі па крэдытах у нацыянальнай валюце скараціліся ўдвая», — удакладніла эканаміст банка.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ЗАМЕСТ «СПАТКАННЯ» — «ЛЕПІМ САМІ»



У магазіне «ProЗапас» шырокі асартымент тавараў.

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

На трасе, што вядзе з Мінска да Мікашэвіч, у вёсцы Шышчыцы яшчэ нядаўна знаходзіўся самы звычайны бар. Цяпер у ім змянілася літаральна ўсё: назва, інтэр'ер, меню. Толькі кавы тут прапануюць да 24 найменняў з рознымі дабаўкамі.

— Сучасны свет развіваецца вельмі імкліва, усё калісьці новае становіцца з часам састарэлым. Значыць, з такой жа хуткасцю неабходна паспяваць за патрабаваннямі і густамі наведвальнікаў, — лічыць **дырэктар гандлёва-вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Слуцкая база Мінаблспажыўсаюза» Віктар ГУРЫНОВІЧ.** — У кастрычніку 2017 года мы правялі рэбрэндынг бара ў сеткавы аб'ект «Ежа&Кава». Вядома, гэта было няпроста: зрабіць брэнд актуальным, удыхнуць у яго свежыя ідэі, эмоцыі. Мы прапанавалі новую канцэпцыю ў інтэр'еры, расшырылі асартымент страў і кулінарных вырабаў, гарачых напояў. І нашы высілкі не былі марнымі.

> Эксперты ацэньваюць гэтую бізнес-мадэль як высокаперспектыўную для рынкаў СНД. Псіхалогія мадэлі — гэта разумная эканомія.

Людзі ўпадабалі гэтае месца. Сюды штодзень наведваецца да 100 і больш чалавек. Не толькі тыя, хто праязджае па трасе (у тым ліку і замежныя



Дырэктар гандлёва-вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Слуцкая база Мінаблспажыўсаюза» Віктар ГУРЫНОВІЧ.

госці), але і мясцовыя жыхары. Менавіта пад кожную катэгорыю кліентаў распрацавалі меню. Вынік — рознічны тавараабарот у параўнанні з адпаведным мінулагоднім перыядам павялічыўся амаль удвая.

Як кажуць, у Слуцку ўсё па-людску. Цалкам можна з гэтым пагадзіцца пасля наведвання закусачнай «Лепім самі», што знаходзіцца на вуліцы Леніна, 185. Раней тут было кафэ «Спатканне». У кастрычніку гэтага года яно змяніла спецыялізацыю. Тут можна заказаць пельмені, манты, хінкалі, піцы з рознымі начынкамі... Знаходзячыся ў абедзеннай зале, праз шырокае шкло кліент назірае за тым, як гатуецца яго заказ. Прычым ён можа папрасіць пакласці ў пельмені большую або меншую колькасць фаршу або раскатаць аснову для іх большых ці меншых памераў і таўшчыні. Наведнікам прапануюць толькі пельменяў да дзесяці відаў: з курацінай, свінінай, ялавічынай, грыбамі, марской капустай і рысам. Апошнія, дарэчы, называюцца «Ні рыба, ні мяса». Закусачная ніколі не пустуе, людзі нават заказваюць прадукцыю на вынас. За адносна кароткі час тавараабарот аб'екта харчавання павялічыўся практычна ў два разы.

У гэтым жа будынку, дарэчы, размешчаны магазін эканомкласа «ProЗапас». Што гэта такое?

У буйных гарадах з'явілася шмат гандлёвых аб'ектаў у фармаце «магазін каля дома». Значыць, узмацнілася канкурэнцыя паміж гандлёвымі прадпрыемствамі розных формаў уласнасці. І тут, як кажуць, выжывае больш прадпрымальны, ініцыятыўны. Так узнікла ідэя гандлёвага аб'екта эканомкласа ў новым фармаце — магазін-склад, або cash&carry. Ён сумяшчае характарыстыкі аптовага цэнтра і рознічнай крамы. Эксперты ацэньваюць гэтую бізнес-мадэль як высока перспектыўную для рынкаў СНД. Псіхалогія мадэлі — гэта разумная эканомія. Нізкія цэны не за кошт зніжэння якасці тавараў, а за кошт аб'ёма пакупкі.

Пры набыцці тавараў оптам у тры адзінкі і больш дзейнічае зніжка — 15% ад рознічнай цаны. Гэта сокі, соکі і кашы для дзіцячага харчавання, кандытарскія вырабы (цукеркі, зефір, пячэнне, вафлі), мясныя і рыбныя кансервы, крупы, мука, макарона, цукар, яйкі, малако ў тэтрапакетах, соусы, алей, безалкагольныя напоі. Працуе магазін з 9.00 да 22.00 без выходных. Плануецца, што ў недалёкай перспектыве тавараабарот гандлёвага аб'екта дасягне 70—90 тыс. рублёў штомесяц. Ужо цяпер сярэдняя сума пакупкі на чалавека ў дзень павялічылася ў два разы.

**Валерый МАРЫНІЧАЎ, старшыня праўлення Мінаблспажыўсаюза:**

— Гэта адзін з першых магазінаў, які адкрыўся ў Мінскай вобласці і ў Беларусі. Плануем такія і ў іншых райцэнтрах. Увогуле ж, у цэнтральным рэгіёне налічваецца 1652 гандлёвыя аб'екты, 71 з іх размяшчаюцца ў сельскіх населеных пунктах. У сельскай мясцовасці самая вялікая ўдзельная вага спажыўкааперацыі, таму там маштабныя праекты не так проста ажыццявіць. Але будзем імкнуцца да таго, каб жыхары маглі атрымліваць увесь асартымент паслуг і тавараў, якія ёсць у горадзе.

***— Валерый Мікалаевіч, усё ж такі ці выжыве спажыўкааперацыя ў межах сучаснай жорсткай канкурэнцыі?***

— Спажыўкааперацыя, на маю думку, была і будзе. Мы даўно на гэтым рынку. У наступным годзе адзначым 80-годдзе нашай сістэмы. Узрост сведчыць сам за сябе. Вядома, цяпер канкурэнцыя вялікая, але яна больш датычыцца райцэнтраў, гарадоў, буйных пасёлкаў. А пайсці ў дробныя вёскі з насельніцтвам да 50 чалавек не так шмат ахвотных. І гэтую работу мы бралі і будзем браць на сябе. Нават тыя населеныя пункты, дзе няма стацыянарных аб'ектаў гандлю, абслугоўваем аўтамагазінамі тры разы на тыдзень. І ў далейшым не адмовімся ад іх абслугоўвання.

***— З 1 студзеня 2018 года ўступіць у сілу Указ Прэзідэнта №345. Дакумент скіраваны на развіццё гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання ў сельскай мясцовасці і малых населеных пунктах і дае падатковыя і іншыя прэферэнцыі. Не баіцеся, што туды хлынуць прадпрымальнікі і гэта ўзмоцніць канкурэнцыю?***

— Мы не баімся канкурэнцыі. Кожны раз думаем пра тое, як павінны ўдасканальвацца, па якім шляху, у якіх напрамках рухацца. Нават калі ў прадпрымальніка не з'явіцца жаданне прыйсці ў вёску, мы будзем ажыццяўляць гандаль, бо разумеем, што пакінуць вясковых жыхароў не маем права. А калі прыйдзе больш дастойная замена, мы гатовы ўступіць месца. Адзінае, хацелася б, каб канкурэнцыя была добрасумленная і ўмовы для ўсіх былі аднолькавыя.

Жыццё не стаіць на месцы, прыходзяць новыя віды гандлю. Таму і мы вымушаны не адставаць, прымяняць увесь комплекс мер, каб не страціць пакупнікоў, прапаноўваць акцыі, зніжкі. Часта арганізуем выязны гандаль, выкарыстоўваем і такую магчымасць, як кірмашы. Толькі сёлета больш за дваццаць разоў у іх удзельнічалі і дадаткова рэалізавалі тавараў на 10 млн рублёў. Стараемся прадстаўляць і ўласную прадукцыю. Акрамя гандлю, у нас ёсць прамысловыя прадпрыемствы па выпуску напояў, мінеральнай вады, мясных вырабаў, каўбас, хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў, кансерваў з агародніны. Вядзём нарыхтоўчую дзейнасць. Толькі сёлета насельніцтву за здадзеную прадукцыю выплацілі каля 5 млн рублёў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** lazovskaya@zviazda.by

# ПА ПРЫЧОСКУ — У СУСЕДНЮЮ ВЁСКУ

## Што адбываецца з бытавым абслугоўваннем у сельскай мясцовасці

**Ці шмат аб'ектаў бытавога абслугоўвання працуе сёння ў вёсках? Што з паслуг карыстаецца найбольшай папулярнасцю? Якія праблемы ёсць у гэтай галіне? І як заахвоціць бізнесменаў адкрываць СТА і майстэрні ў аграгарадках?**

### *Адзін комплексны пункт на дзве тысячы чалавек*

У краіне адкрыта 26 тысяч аб'ектаў бытавых паслуг. Толькі 14 працэнтаў з іх (гэта 3,7 тысячы) працуюць у сельскай мясцовасці. Калі глядзець на агульную статыстыку, то найбольш шырока прадстаўлены паслугі цырульняў (чвэрць ад агульнай колькасці), па тэхнічным абслугоўванні транспарту (12,3%), пашыве швейных вырабаў (10%), абслугоўванні камп'ютараў і рамонце бытавых тавараў (7,4%). Найменшая доля — у паслуг, звязаных з будаўніцтвам і рамонтам (хоць два гады таму яны былі самымі папулярнымі), арганізацыяй пахаванняў, СПА-працэдурамі.

Асноўная нагрузка па аказанні бытавых паслуг сельскаму насельніцтву ўскладзена на камунальныя арганізацыі бытавога абслугоўвання. Ёсць пэўныя нарматывы. Так, на 1,8—2,2 тысячы чалавек павінен прыходзіцца адзін комплексны прыёмны пункт. У аграгарадках распаўсюджана выязное абслугоўванне. У сельскіх пунктах з колькасцю жыхароў больш за 200 яно ажыццяўляецца не радзей як раз на два тыдні, калі ж у вёсцы насельніцтва менш за 200 чалавек — па заяўцы на працягу двух тыдняў.

Штогод камунальныя арганізацыі з улікам спажывецкага попыту пашыраюць спектр паслуг. Напрыклад, прапануюць чыстку пуха-пёравых вырабаў, рамонт ювелірных упрыгажэнняў, мыццё дываноў, афарбоўку аўтамабіляў, масаж. Гэта дазваляе павялічыць аб'ёмы выручкі.

Як будзе развівацца сфера? Асноўныя кірункі прапісаны ў праграме «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2016—2020 гады. Гэта прырост аб'ектаў у сельскай мясцовасці, адкрыццё дадатковых відаў паслуг, развіццё выязнога абслугоўвання, каб забяспечыць людзей якасным сэрвісам па даступных цэнах незалежна ад месца жыхарства, прыцягненне маладых спецыялістаў у галіну.

### *Новыя льготы для бізнесу*

Бадай, асноўныя праблемы ў сферы — нераўнамернае размяшчэнне сеткі аб'ектаў, розны ўзровень абслугоўвання ў горадзе і вёсцы і недастатковая інвестыцыйная прыцягальнасць для прыватнага бізнесу. Прадпрымальнікі не зацікаўлены адкрываць цырульні і рамонтныя майстэрні на сяле з-за іх нізкай рэнтабельнасці. Апошнія гады назіралася скарачэнне колькасці аб'ектаў бытавога абслугоўвання ў вёсках. І Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, як дзяржорган, што рэгулюе гэту сферу, было занепакоена такой тэндэнцыяй.

Мяркуецца, што прыняцце Указа №345 «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання» станоўча паўплывае на сітуацыю. Для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія працуюць на сяле, будуць устаноўлены паніжаныя стаўкі па падатку на прыбытак і па падаходным падатку з фізічных асоб у памеры 6 працэнтаў. Для ІП, якія плацяць адзіны падатак, — стаўка ў памеры базавай велічыні ў месяц (на сёння гэта 23 рублі). Таксама прадугледжваецца вызваленне абароту ад падатку на дабаўлены прыбытак. Не давядзецца сплачваць і падатак на нерухомасць і арэндную плату за ўчасткі, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці і выкарыстоўваюцца ў якасці аб'ектаў бытавых паслуг у вёсках. Плюс арганізацыі і ІП атрымаюць права набываць памяшканні без правядзення аўкцыёну па рынкавым кошце.

Скарыстацца гэтымі прэферэнцыямі бізнес зможа з 1 студзеня 2018 года. Пад дзеянне ўказа ўжо трапіла больш за 60 працэнтаў сельскіх населеных пунктаў. Больш за ўсё іх у Віцебскай вобласці — амаль 5,7 тысячы (88 працэнтаў ад агульнай колькасці). На Брэстчыне ў пералік уключылі 1,5 тысячы вёсак і аграгарадкоў (70% ад усіх), на Гомельшчыне — 1,6 тысячы (72%), на Магілёўшчыне — 1,7 тысячы (60%), на Гродзеншчыне — каля 4,3 тысячы (99,7%). У Мінскай вобласці пад дзеянне ўказа трапіць менш як 500 сельскіх пунктаў (8%).

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
lubneuskaya@zviazda.by

# ДОМІК ДЛЯ БОБІКА І НЕ ТОЛЬКІ

## Могуць змайстраваць слуцкія бытавікі

**«Зрабіце мне будку для сабакі!» — з такой незвычайнай просьбай звярнулася ў цэнтральны Дом быту адкрытага акцыянернага таварыства «Слуцкая фабрыка пашыву адзення» пажылая жанчына адной з вёсак раёна. «Гаспадар памёр, дзеці жывуць далёка, а дом майго Бобіка зусім разваліўся. Дапамажыце, калі ласка, разлічуся з вамі як мае быць», — папрасіла жанчына.**

«Добра, дапаможам вам, не гаруйце», — супакоілі кабету. Жытло для сабакі зрабілі прасторнае, дыхтоўнае, з двайным дном, каб не мёрз хвастаты ў моцныя маразы. Жанчына засталася задаволеная.

— Будка для сабакі — для нашых майстроў не праблема. Нашы ўмельцы могуць зрабіць прафесійны рамонт і ў доме, і ў кватэры, — запэўніў **дырэктар таварыства Аляксандр ВАЛАТОВІЧ.**

Аляксандр Мікалаевіч працуе ў сферы бытавога абслугоўвання 34 гады, у тым ліку кіраўніком — 29 гадоў. Мае шматлікія граматы, падзякі, а нядаўна ўзнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».



Дырэктар ААТ «Слуцкая фабрыка пашыву адзення» Аляксандр ВАЛАТОВІЧ нядаўна ўзнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».

Набываюць яны ўсё большую папулярнасць і ў Беларусі. Сапраўды, выгадна: не трэба дома паліць электраэнергію, траціць свой час. Сюды, дарэчы, прывозяць спецадзенне прадпрыемствы, карыстаецца паслугай і футбольны клуб «Слуцк». Акрамя таго, у камбіната ёсць і вялікая пральня, размешчаная ў асобным будынку.

Літаральна нядаўна ўстанавілі новае абсталяванне для хімчысткі, якое



Юныя мадэлі дэманструюць новыя паліто, якія шыюць на прадпрыемстве.

— Мы аказваем больш як 17 відаў бытавых паслуг, — кажа Аляксандр Валатовіч. — Імкнёмся, каб асноўны спектр іх быў сканцэнтраваны ў цэнтральным будынку. Невялікія свабодныя плошчы здаём прадпрымальнікам. Яны рамантуюць гадзіннікі, ювелірныя ўпрыгажэнні, складана-бытавую тэхніку, мабільныя тэлефоны, робяць ключы.

**Слуцкія бытавікі першымі пачалі афарбоўку аўтамабіляў. Такой паслугі пакуль няма ні ў адным раённым камбінаце Беларусі. Яна карыстаецца попытам як у жыхароў, так і ў прадпрыемстваў, арганізацый.**

Кожны год тут укараняюцца новыя формы абслугоўвання насельніцтва. Напрыклад, у цэнтральным офісе адкрылі развітальную залу. У жыцці кожнага з нас здараюцца трагедыі — паміраюць родныя, блізкія. Але не ў кожнага ёсць магчымасць прыняць людзей, якія хочуць развітацца з нябожчыкам. І многія здымаюць залу на пэўны час. Працуе яна кругласутачна. Побач — цэх рытуальных паслуг, дзе можна набыць усё неабходнае, каб дастойна правесці чалавека ў апошні шлях. Работнікі прадпрыемства самі ад пачатку да канца робяць вянкі, кошыкі з кветкамі, жалобныя стужкі.

Ніколі не пустуе і пральня самаабслугоўвання. Тут можна памыць рэчы, пасцельную бялізну ды іншае самім. Няма часу — гэта зробяць за кліента работнікі. Дарэчы, такога кшталту паслугі вельмі запатрабаваны за мяжой.

працуе на вадародным растваральніку, што дазволіць павялічыць пералік паслуг.

На прадпрыемстве ёсць людзі — сапраўдныя унікумы, з якіх біруць прыклад астатнія. Напрыклад, Марыі Шчарбачэні 76 гадоў. Працуе жанчына ў цэху шыцця адзення. Прызнаецца, што не ўяўляе сябе без работы, без калектыву. «Цяпер вельмі прыгожыя мадэлі ў нас распрацоўваюць. А раней па блаце даставала часопіс мод «Бурда» і шыла па ім адзенне знаёмым і дзецям».

У цэху ўстаноўлена «разумная» швейная машынка. Пры ўключэнні яна вітае швачку і жадае добрага працоўнага дня. Дробязь — а настрой узнімае.

У сельскай мясцовасці працуе 21 стацыянарны комплексны прыёмны пункт, дзе аказваюць не менш за 11 паслуг. У аддаленых і малакольскасных вёсках арганізавана выязное абслугоўванне адпаведна з графікам — не менш як раз на два тыдні. Машына прыходзіць нават туды, дзе пражывае 3—7 чалавек. Людзі могуць здаць у рамонт, у чыстку любую рэч. Пасля выканання заказу яе даставяць назад.

Комплексны прыёмны пункт аграгарадка Вясеі абслугоўвае дзевяць населеных пунктаў.

Карыстаюцца попытам пашыў і рамонт адзення, абутку, бытавой тэхнікі, паслугі цырульніка і рытуальныя паслугі. Людзі з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, састарэлыя і наогул усе, каму не стае часу прыехаць у прыёмны пункт, могуць заказаць цырульніка дадому. Наведваецца майстар і ў мехмайстэрні адкрытага акцыянернага таварыства «Вясейскі Пакроў» паводле адпаведнага дагавора з гаспадаркай.

— Мы заўсёды ўдзельнічаем у святах вёсак, па ўзгодненым графіку выязджаем разам са спажыўкааперацыяй у населеныя пункты, — кажа **начальнік участка па аказанні бытавых паслуг у сельскай мясцовасці Ала ЛЮЦКО.** — Заключаем таксама дагаворы на аказанне паслуг з суб'ектамі гаспадарання.

— Якія цяжкасці ў сельскіх бытавікоў у параўнанні з гарадскімі калегамі? — пацікавілася ў яе.

— Ніякіх адрозненняў. Хіба што жыццё стала крыху даражэйшае і людзі вымушаны эканоміць. Напрыклад, пачалі купляць больш дарагі і якасны абутак, каб менш рамантаваць.

Разам з тым аказанне паслуг на сяле стратнае, адзначыў Аляксандр Валатовіч.

— Не вельмі ахвотна ідуць сюды прадпрымальнікі. Але мы разумеем, што вяскоўцы павінны мець магчымасць задаволіць свае бытавыя патрэбы. Таму вымушаны перакрываць гэтую стратнасць паслугамі, якія аказваем у горадзе. Імкнёмся працаваць прыбыткова, рэнтабельна, павялічваць аб'ёмы паслуг.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
lazovskaya@zviazda.by

**Лілія ПУЛКО, начальнік упраўлення бытавога абслугоўвання насельніцтва Мінскай вобласці:**

— У кожным раёне вобласці на базе раённых камбінатаў бытавога абслугоўвання арганізаваны дыспетчарскія пункты па прыёме заказаў і працуе адзіны кароткі нумар — 167. Па ім людзі могуць атрымаць кансультацыю пра паслугі, якія аказваюцца ў раёне, цэны на іх. Для зручнасці насельніцтва поўны комплекс паслуг павінен быць сканцэнтраваны ў адным месцы. Таму адпаведныя прадпрыемствы Мінскай вобласці развіваюць іх у цэнтральных дамах быту. Раённыя камбінаты прапануюць ад 11 да 20 відаў паслуг.

У апошнія гады дамы быту змяніліся як звонку, так і ўнутры, ператварыліся ў абноўленыя шматфункцыянальныя цэнтры. Павышаецца якасць абслугоўвання, уводзяцца новыя віды паслуг, набываецца сучаснае абсталяванне. Напрыклад, у Бараўлянскі дом быту купілі спецыяльную машыну, якая мые, сушыць, расчэсвае дываны. Чалавеку не трэба самому везці груваствую рэч, яе забіраюць транспартам, а потым вяртаюць гаспадару. Гэтая паслуга добрая тым, што не трэба выклікаць дадому чысцільшчыка, які прымяняе хімічныя рэчывы, і, пакуль дыван сохне, хатнія імі дыхаюць.

У вобласці ёсць чатыры вышывальныя камп'ютарныя машыны, якія могуць аздобіць рэч любымі ўзорамі. Напрыклад, у Нясвіжы па заказе вышываюць на рагу «канверта» імя немаўляці, якое толькі нарадзілася.

У сельскай мясцовасці бытавыя паслугі аказваюць 247 комплексных прыёмных пунктаў, якія належаць раённым камбінатам бытавога абслугоўвання. У аддаленыя і малакольскасныя вёскі выязджаюць па графіку спецыяльныя машыны. Гэта дазваляе прымаць і па меры выканання дастаўляць спажыўцу заказы.

МЕРКАВАННІ

## Як наблізіць бытавыя паслугі да сельскага спажыўца?

**Ці створаных умоў ужо дастаткова? Каб высвеtліць гэта, мы пагаварылі з людзьмі, у задачу якіх і ўваходзіць развіццё названай сферы.**

**Намеснік старшыні Ельскага раённага выканаўчага камітэта Генадзь ЛАПАЦЕНКА:**

— Я не сказаў бы, што ў нашым раёне бытавыя паслугі аказваюцца не ў поўнай меры. У нас вельмі добры камбінат бытавога абслугоўвання з дасведчаным кіраўніком. Менавіта дзякуючы намаганням гэтага чалавека ў нас сапраўды высокі вынік працы як у вобласці, так і ў краіне. Таму я сказаў бы, што некаторым раёнам нават ёсць чаму ў нас павучыцца. Калектыў камбіната невялікі — 27 чалавек, і ў раёне яшчэ 8 комплексных прыёмных пунктаў. А тыя людзі, якія працуюць у сельскай мясцовасці, прымаюць заяўкі на паслугі. Нават не магу сказаць, што яшчэ дадаткова можна прапанаваць. Дарэчы, наколькі мне вядома, нараканняў з боку насельніцтва на бытавое абслугоўванне няма. Безумоўна, можна разважаць, што адкрыццё, скажам, дамоў быту ў дробных населеных пунктах дасць працоўныя месцы, аднак як гэта акупіць? А адкрываць, каб усё проста стаяла, — навошта? Глядзіце: у нас 65 населеных пунктаў, але толькі ў чатырох пражывае больш за 500 чалавек. Таму выезду аўтамабіляў цалкам дастаткова. Ды і людзі ведаюць, як гэта працуе, — для іх складзены зручны графік.

**Начальнік аддзела эканомікі Бялыніцкага раённага выканаўчага камітэта Алена СЕЛІВЕСТРАВА:**

— Літаральна нядаўна прынята рашэнне раённага выканаўчага камітэта ад 5 кастрычніка 2017 года «Аб бытавым абслугоўванні сельскіх населеных пунктаў». І гэтым рашэннем мы зацвердзілі графік выязнога абслугоўвання пры наяўнасці заявак. Я лічу, што мы аператыўна рэагуем на пажаданні жыхароў, а гэтым рашэннем нам удалося ахапіць усе сельскія населеныя пункты. Выезд машын з кваліфікаванымі людзьмі — гэта ідэальны варыянт. Навошта трымаць у кожнай вёсцы штат супрацоўнікоў? Па-першае, гэта немагчыма, а па-другое, няма неабходнасці. Сістэма, якая зараз працуе, выдатная. Скаргаў у нас няма. Як і зваротаў, у якіх просяць дадаць нейкую паслугу, — пералік і так даволі шырокі.

**Дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскі раённы камбінат бытавога абслугоўвання» (г. Заслаўе) Наталля ТОЗІК:**

— Зараз у нас усё ідэальна, пытанняў насамрэч хапае. У вялікім горадзе, буйным раённым цэнтры працсей, а вось у прысталічны шмат праблем. Хоць бы таму, што не ў кожным населеным пункце ёсць комплексны прыёмны пункт, у якім на месцы аказваюцца бытавыя паслугі. Ёсць праблема інфармаванасці насельніцтва. У гэтым годзе мы ўвялі даведачны нумар 167, па якім можна задаць любое пытанне, даём аб'явы ў раённай прэсе. Аператары службы, на жаль, сутыкаюцца з просьбамі, якія не ўваходзяць у нашу кампетэнцыю: скажам, людзі просяць звязаць іх з энергазбытам, пытаюцца, ці можна некуды «прыстроіць» шчанюкоў і гэтак далей. Але гэта нашы людзі, мы ўсім спрабуем дапамагчы.

Што датычыцца асартыменту паслуг, то прапануем максімальную колькасць варыянтаў. Напрыклад, у Мінскім раёне не хапала спецыялістаў па рамонце бытавой тэхнікі — імпартных тэлевізараў, пральных машын. Што мы зрабілі? Заключылі дагаворы ўзаемнага супрацоўніцтва з прыватнымі арганізацыямі. І работа вядзецца па такой схеме: наш аўтамабіль забірае з вёскі той жа тэлевізар, вязе ў Мінск майстру, пасля спраўную тэхніку вяртаем чалавеку. Грошы за працу атрымлівае прыватнік, мы ж атрымліваем грошы за перавозку. Такі вось прыклад партнёрства. Аналагічныя дагаворы ў нас ёсць і па хімчыстцы.

**Старшыня Жодзішкаўскага сельвыканкама Смаргонскага раёна Святлана КУЧАРАВА:**

— Калі шчыра, я нават не ведаю, што яшчэ прыдумаць, — настолькі ўсё прадумана ў Смаргонскім раёне. У нас два камбінаты бытавога абслугоўвання, выхадныя ў іх толькі нядзеля і панядзелак. Усё можна заказаць, паколькі большасць тавараў ёсць у продажы. Што датычыцца бліжніх населеных пунктаў, то туды пастаянна выязджаюць аўтамабілі, у якіх ёсць усё неабходнае для людзей. Мы прымаем заяўкі, пасля чаго машына развозіць усё па вызначаным маршруце. Вядома, бывае і такое, што чагосьці няма. Аднак пытанне вырашаецца ўжо праз тыдзень, дастаткова афарміць паперу — і ўсё аператыўна падвязуць. Зусім неабавязкова ў кожным населеным пункце мець свой камбінат або падобны пункт. Яны патрэбныя толькі там, дзе пражывае шмат людзей. А ў той жа вёсцы — прыязджае машына, здаеш рэчы ў хімчыстку або на папраўку і чакаеш, калі ўсё гатовае прывязуць. Ці трэба пашырыць асартымент паслуг? Я лічу, што ўсяго хапае. А калі не хапае, то мы прывязём.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** lukashevich@zviazda.by

КУЛЬТУРНЫ ПРАРЫЎ

# ШТО Ў СПАДЧЫНЕ ТАБЕ МАЁЙ?

## Чаму ў музеях нашай краіны павінны быць арыгіналы рарытэтаў і якім чынам вяртаць на радзіму страчаныя культурныя каштоўнасці

**У Беларусі няшмат мясцін, здольных паспрачацца сваёй вядомасцю з Мірскім замкам. Для многіх замежных турыстаў знаёмства з нашай краінай пачынаецца якраз з чырвона-белых вежаў. Не дзіўна, што выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах таксама прайшло ў культурным сэрцы пасёлка Мір. Тэмай абмеркавання стала магчымасць выкарыстання патэнцыялу гістарычнай і культурнай спадчыны для ўмацавання міжнароднага іміджу Рэспублікі Беларусь.**



### Чысценька, але бедненька?

Нягледзячы на крызісы, людзям усё роўна даспадобы падарожнічаць. Сёння міжнародны турызм складае 7 працэнтаў у агульным экспарце тавараў і паслуг, на яго долю выпадае 10 працэнтаў сусветнага ВУП.

Беларусь — зручная для вандроўнікаў краіна. Сюды лёгка трапіць на большасці відаў транспарту, да таго ж тут існуе практыка бязвізавага ўезду.

Разам з тым у замежных гасцей існуе шэраг стэрэатыпаў пра Сінявокую, самыя папулярныя з іх агучыла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах Вольга ПАПКО**. Напрыклад: «Беларусь — апошні «кавалак» СССР», «у беларусаў існуе культ Вялікай Айчыннай вайны», «беларусы не маюць нацыянальных сімвалаў, яны карыстаюцца сваёй мовай, замяняючы яе на рускую».

— Вядома, хочацца, каб пра нас думалі зусім іншае, — падсумавала парламентарый. — Трэба даказаць замежным гасцям, што мы жывём у еўрапейскай краіне, якая захоўвае частку еўрапейскай гісторыі, маем старажытную дзяржаўнасць, паважаем сваю спадчыну, шануем і адбудоўваем помнікі. І паспрыяць зменам у стаўленні турыста да Беларусі, на маю думку, можна якраз праз задзейнічанне гісторыка-культурных аб'ектаў.

Як правіла, турысты прыязджаюць у краіну з нейкім базавым яе веданнем, хай нават на ўзроўні «нешта прачытаў» або «пачуў ад знаёмага». І перад работнікамі музеяў, экскурсаводамі паўстае задача: «улюбіць» наведвальніка ў мясціну. Гід з валоданнем замежнымі мовамі, аўдыязапіс экскурсіі або буклет дазволяць госцю з камфортам успрымаць інфармацыю на роднай для яго мове. Таксама патрэбны даступныя сувенірныя крамы з сімволікай або атрыбутыкай музея.

Трэцім важным складнікам, на думку Вольгі Папко, з'яўляюцца самі экспанаты:

— Прывяду прыклад. У часы маёй работы ў Мірскім замку пачула размову дзвюх жанчын. Адна з іх пасля наведвання экспазіцыі сказала: «Тут гэтак жа, як паўсюдна ў Беларусі, — чысценька, але бедненька». Быў 2012 год. З таго часу музейная экспазіцыя замка значна змянілася, але фраза засталася ў памяці. Людзі не хочуць глядзець на фотаздымкі прадметаў — ім цікава пабачыць саму гісторыка-культурную каштоўнасць. Чым больш іх захоўваецца ў музеях, тым большы прэстыж набывае краіна.

### Я тваго не вазьму і свайго не аддам

І тут паўстаюць пытанні рэстытуцыі — вяртання гістарычных і культурных каштоўнасцяў на радзіму. Справа ў тым, што новы «Кодэкс Беларусі аб культуры» змяшчае артыкул, які датычыцца неабходнасці вяртання культурнай спадчыны. Таксама ў кодэксе запісаны правы і абавязкі, якія атрымлівае камісія па вяртанні. Але сам механізм, па якім павінна дзейнічаць камісія ў выпадку, калі нешта будзе знойдзена, адсутнічае. Вольга Папко адзначыла, што ініцыятыўная група ўжо пачала работу над дапрацоўкамі ў кодэкс, якія можна было б прапанаваць у якасці дапаўненняў.

**Ігар МАРЗАЛЮК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы**, звярнуў увагу на захаванне статусу некаторых каштоўнасцяў, як аб'ектаў, што адносяцца непасрэдна да беларускага культурнага здабытку.

— Безумоўна, існуе агульная культурная спадчына, але трэба мець павагу да суседзяў, асабліва калі некалькі краін прэтэндуюць на помнік як на нацыянальную спадчыну. Гэта не значыць, што трэба закідваць «канкурэнтаў» нотамі пратэсту. Прапаную акцэнтаваць увагу на тых аспектах ідэнтычнасці, якія належаць толькі беларусам, аднак без адрыву ад агульнага гістарычнага кантэксту.

У прыватнасці, старшыня Пастаяннай камісіі прапанаваў некалькі знакавых мясцін, на аснове якіх можна актывізаваць такую дзейнасць. Гэта Хатынь, Курапаты і Бяроза-Картузская. Там адбываліся важныя для беларусаў падзеі, і гісторыя месцаў дазволіць арганізаваць сумесную работу з расіянамі, украінцамі, палякамі. Такім чынам можна не толькі адсачыць гісторыю нашай дзяржаўнасці, але і зняць завесы недасведчанасці, спекуляцый на мінулым.

— Міністэрства замежных спраў рэгулярна ставіць пытанне аб вяртанні гістарычных каштоўнасцяў падчас сустрэч з расійскім бокам. У прыватнасці, існуе праграма сумесных дзеянняў у галіне міжнароднага супрацоўніцтва. У мінулым годзе мы паспрабавалі паставіць у тэматыку перагавораў абмеркаванне пытання сумеснай работы па выяўленні агульных культурна-гістарычных каштоўнасцяў і сумесным іх выкарыстанні. Думаю, што нейкі адказ на прапанову можна будзе атрымаць ужо ў красавіку — маі, — лічыць **Ларыса БЕЛЬСКАЯ, начальнік галоўнага ўпраўлення шматбаковай дыпламатыі Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь.**

Дарэчы, што датычыцца сумеснай работы Беларусі і іншых краін, то мы ўдзельнічаем ва ўсіх асноўных канвенцыях ЮНЕСКА ў галіне культуры. Магчыма, у будучыні ў транснацыянальную намінацыю трапіць і частка праспекта Незалежнасці ў Мінску — як прыклад пасляваеннай сацыялістычнай архітэктуры. Ёсць магчымасць таго, што пад міжнароднай аховай апынецца такі нематэрыяльны аб'ект, як Будслаўскі фэст. У спіс памятных дат ЮНЕСКА былі ўключаны і мерапрыемствы, прымеркаваныя да юбілеяў Францыска Скарыны і Ігната Дамейкі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*

**Ігар МАРЗАЛЮК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы:**

— Калі мы гаворым пра імідж краіны, то павінны звярнуцца і да рэгулявання экскурсійнай дзейнасці. Мне неаднаразова даводзілася чуць заўвагі прафесійных экскурсаводаў наконт таго, што ў нас няма парадку ў арганізацыі экскурсійнага суправаджэння. Інакш кажучы, турыстычныя групы выязджаюць і ходзяць, дзе захочацца, гіды расказваюць турыстам што хочуць, хоць часам нават не маюць прафесійнай акрэдытацыі. У той жа час у Італіі ці, нават бліжэйшай да нас, Літве існуюць зацверджаныя, выверaныя і дакладныя маршруты і пэўны кантэнт для кожнай экскурсіі. Не думаю, што такі падыход прыраўноўваецца да цэнзуры. Проста гасцям трэба даваць дакладныя, пацверджаныя даследчыкамі факты.

**Марына МАСТАШОВА, кансультант дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь:**

— На маю думку, у Беларусі ўсё яшчэ не хапае інфармацыйных шчытоў, паказальнікаў, у тым ліку з выкарыстаннем лацінскай транскрыпцыі. Патрабуе аператыўнага вырашэння пытанне абслугоўвання ў музеях. Цудоўна, калі на знакавых аб'ектах ёсць супрацоўнікі, якія валодаюць замежнай мовай, запісаны аўдыягіды і гэтак далей. Але для большасці рэгіянальных музеяў такі падыход пакуль што застаецца марай.

Трэба адзначыць, што часта экскурсійныя маршруты застаюцца неабсталяванымі. Няма паркоўкі для аўтобусаў побач з аб'ектам, адсутнічаюць сувенірныя кіёск, бістро, месцы грамадскага карыстання. Не хапае банкаматаў, і гэта сапраўды крыўдна. Уявіце, што замежны турыст, які прыехаў на Лінію Сталіна, хоча скарыстацца платнымі паслугамі, напрыклад пакатацца на танку, але магчымасці зняць або абмяняць грошы паблізу няма. У выніку мы губляем прыбытак.

ПЫТАЛЬНІК

# Як знайсці дзедаву магілу пад Берлінам

## і атрымаць даведку, што яны разам з бацькам былі партызанамі?

*Мае бацька і дзед у вайну былі ў партызанах Старобінскага злучэння. Па расказах таты, Хаміцэвіча Адама Васілевіча 1924 года нараджэння, яны разам з яго бацькам Хаміцэвічам Васілём Герасімавічам знаходзіліся ў час вайны ў складзе партызанскага злучэння імя Аляксандра Неўскага. Тата назваў і атрад. На жаль, я яго забыў. Памятаю толькі, што атрад называўся па нейчым прозвішчы. Калі не памыляюся, гэта быў атрад Бандараўца.*

*Дапамажыце, калі ласка, знайсці даведку, што мае дзед і тата былі партызанамі. Пры жыцці тата не хацеў, каб мы варушылі тую вайну. Дзед загінуў пад Берлінам. Вельмі хацелася даведацца, дзе ён пахаваны. Была пахавальная, але яна згубілася. Тата праслужыў, калі ўлічваць і партызанскі атрад, з 1943-га па 1949 год.*

*І яшчэ. Тата мне расказваў, што, калі яго прызвалі ў войска, ім зацікавіўся асобы аддзел. У маладога байца была вайсковая падрыхтоўка. Пасля праверкі, што атрымаў яе ў партызанскім атрадзе, яго пакінулі ў спакоі. Тата быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай зоркі, медалямі за Варшаву, Берлін, за Перамогу. Памёр 27 лютага 2007 года.*

**З павагай да «Звязды» ваш падпісчык Мікалай Адамавіч ХАМІЦЭВІЧ, вёска Доўгае Салігорскага раёна.**

Каб атрымаць даведку аб удзеле ў партызанскім і падпольным руху на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, трэба звярнуцца ў Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Дарэчы, дакументаў аб праходжанні службы ў дзеючай Чырвонай арміі Нацыянальны архіў не мае, можна паспрабаваць звярнуцца ў Цэнтральны архіў Міністэрства абароны ў Расійскай Федэрацыі (Маскоўская вобласць, горад Падольск, вуліца Кірава, 74).

Даведка аб удзеле ў партызанскім і падпольным руху на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны выдаецца на бязвыплатнай аснове для ўдзельнікаў партызанскага і падпольнага руху, іх блізкіх сваякоў (муж, жонка, дачка, сын) ці для арганізацыі, якой неабходна даць інфармацыю па запыце. Як удакладнілі ў аддзеле выкарыстання дакументаў і інфармацыі архіва, патрэбная папера выдаецца на працягу двух тыдняў пасля пісьмовага звароту.

Пісаць трэба на імя дырэктара Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь па адрасе: 220114, горад Мінск, праспект Незалежнасці, 116. У запыце неабходна пазначыць прозвішча, імя, імя па бацьку таго, на каго неабходная даведка (калі гаворка пра жанчыну, тады і дзявочае прозвішча). Апроч гэтага — месца нараджэння, месца пражывання (на 22.06.1941), назву партызанскага фарміравання і/ці падпольнай групы (арганізацыі), час удзелу ў партызанскім ці падпольным руху, пазначыць раён дзеяння (населены пункт, вобласць), прозвішчы камандзіра і радавога складу.

Застаецца дадаць, што заявы падаюцца на беларускай ці рускай мовах. Пісьмовыя запыты грамадзян павінны змяшчаць: прозвішча, імя, імя па бацьку або ініцыялы чалавека, адрас яго пражывання (месца знаходжання) і/ці месца працы (вучобы), подпіс.

Што датычыцца пошукаў месца пахавання дзеда, вы (або вашы маладзейшыя родныя ці сваякі) могуць паспрабаваць правесці ўласнае расследаванне праз інтэрнэт. Міністэрствам абароны Расійскай Федэрацыі шмат гадоў таму быў створаны Абагульнены камп'ютарны банк даных, якія змяшчаюць інфармацыю аб абаронцах Айчыны, якія загінулі ці зніклі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ў пасляваенны перыяд (АБД «Мемарыял»).

На сайце можна знайсці інфармацыю пра званне загінулага, часці, у якой ён служыў, дату і прычыну смерці (забіты, памёр ад ран, знік без вестак) і месца пахавання. Там нават выкладзены адсканаваныя копіі ўсіх апрацаваных дакументаў-першакрыніц, што змяшчаюць інфармацыю аб персаналіях. Гэтыя дакументы дазваляюць з вялікай дакладнасцю ідэнтыфікаваць загінулых.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ХТО БУДУЕ БЕЗ ДАЗВОЛУ?

## Як навесці парадак у выдзяленні і асваенні зямельных участкаў

**Не ўсе зямельныя ўчасткі заносяцца ў спісы для правядзення аўкцыёну. Парушаюцца тэрміны іх асваення як інвестарамі, так і грамадзянамі. Назіраюцца выпадкі злоўжывання службовых асоб падчас выдзялення ўчасткаў пад забудову. Гэтыя і іншыя факты выяўлены Камітэтам дзяржкантролю і пракуратурай Гродзенскай вобласці.**



### Паставілі на паток

Ахвотных атрымаць участкі пад будаўніцтва не становіцца менш. Наадварот, гэта лічба павялічваецца, і сёння па вобласці чарга складае 8,5 тысячы чалавек. Катэгорыя тых, хто мае патрэбу, — 7,3 тысячы. Мясцовымі органамі ўлады прапанавана ўсяго 367 участкаў пад індывідуальную забудову, канстатуюць работнікі пракуратуры. Высокая запатрабаванасць назіраецца ў Гродзенскім, Ваўкавыскім, Лідскім, Навагрудскім, Слонімскім раёнах, горадзе Гродна.

Некаторыя службовыя асобы скарысталіся складанай сітуацыяй, каб сарваць куш. Прычым рабілі гэта сістэмна і нават паставілі на паток гандаль зямельнымі ўчасткамі. Як сцвярджае старшы памочнік пракурора Святлана Зайцава, шэраг вінаватых у такіх махінацыях ужо асуджаны. Сярод іх намеснік начальніка і галоўны спецыяліст аддзела ЖКГ Кастрычніцкага раёна Гродна. Іх схема была наступнай. Шукалі асоб, якія імкнуліся правесці адчужэнне зямельных участкаў, і выраблялі заведама лжывыя акты кансервацыі незавершаных жылых дамоў. Па сутнасці прадавалі іх другім асобам. Такім чынам было прададзена 15 участкаў. Атрыманыя грашовыя ўзнагароды дзялілі паміж сабой. Агульная сума склала 100 тысяч рублёў. Вінаватыя асуджаны. Вядзецца работа аб прызнанні здзелак куплі-продажу незаконнымі.









Па прыгаворы суда Берастаўліцкага раёна вясной гэтага года прызнаны вінаватым спецыяліст землеўпарадкавальнай службы райвыканкама — ён абвінавачваецца ў тым, што за 1 тыс. 350 долараў паспрыяў уключэнню зямельнага ўчастка ў спіс свабодных. У маі 2017 года асуджаны начальнік землеўпарадкавальнай службы Гродзенскага гарвыканкама — за спрыяльнае вырашэнне пытання па выдзяленні ўчастка.

### Там расце бур'ян

У асваенні ўчасткаў існуюць пэўныя тэрміны. У прыватнасці, на будаўніцтва жылога дома даецца тры гады, яшчэ на працягу трох гадоў дазваляецца праводзіць кансервацыю. У вызначаныя тэрміны можна ўкласціся, лічаць у пракуратуры. Але кантроль за гэтым з боку службовых асоб недастатковы. Некаторыя ўчасткі выдзелены яшчэ ў 90-я гады, але да гэтага часу не забудаваны.

У землеўпарадкавальнай службе вобласці паведамляюць: штогод пазбаўляюцца правоў на зямлю некалькі сотняў заяўнікаў. Напрыклад, у 2015 годзе было даследавана і адабрана 480 участкаў, у мінулым — 380. Сёлета — амаль 500. З іх пераразмеркаваны 180, і новыя ўладальнікі ўжо вядуць там забудову.

Але ў пракуратуры лічаць, што гэта работа вядзецца марудна. У Лідскім раёне сёлета выяўлены 81 «пратэрмінаваны» ўчастак. У Гродне — усяго 17. Але і па іх няма судовых рашэнняў аб спыненні правоў на зямлю і продаж яе з аўкцыёну. Між тым у Лідзе чаргу на атрыманне ўчасткаў складаюць 810 чалавек, а ў Гродне амаль 4,5 тысячы.

**Як аказалася, многіх людзей не задавальняюць стан і месца ўчастка. Так, сёлета гродзенцам прапанавана 370 участкаў пад будаўніцтва жылля, але толькі палова згадзілася іх набыць. Калі чалавек некалькі разоў адмаўляецца ад прапанаваных участкаў, яго здымаюць з чаргі, паведамілі ў гарвыканкаме.**

Найбольш буйныя мікрараёны індывідуальнай забудовы — гэта Зарыца і Баранавічы. Тут узводзяцца даволі салідныя катэджы, але разам з гэтым можна назіраць і карціну запусцення — многія ўчасткі не маюць агароджы, зараслі бур'янам, узведзены фундамент разбураецца, а кансервацыя не праведзена, што робіць гэтыя аб'екты небяспечнымі для насельніцтва, папярэджваюць работнікі пракуратуры.

### Недасканалы падыход

Не ва ўсіх раёнах ёсць інфармацыя аб свабодных зямельных участках. Часам і даведацца аб гэтым няма ў каго, бо адсутнічаюць адказныя за гэты кірунак дзейнасці. Нізкі ўзровень падрыхтоўкі спраў прыводзіць да паўторнай дапрацоўкі матэрыялаў. Сёлета вернута 25% спраў і матэрыялаў толькі ведамаснай структурай.

Спецыялістамі Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці выяўлены факт, калі на працягу 1,5 года Гродзенскі гарвыканкам чамусьці не ўключаў у спіс свабодных чатыры ўчасткі папулярнага ў забудоўшчыкаў мікрараёна «Забалаць».

**Участкаў для продажу магло б быць і больш, калі б больш актыўна вялася работа па ўцягванні ў абарот пустуючых зямель, лічаць кантралёры. Гэта дазволіла б знізіць кошт і актывізаваць індывідуальнае будаўніцтва. А таксама абмежаваць спекуляцыю ўчасткамі, якая, як вядома, узнікае ва ўмовах дэфіцыту.**

### Дача над возерам

Хоць будаўніцтва ў водаахоўных зонах забаронена, факты самавольных пабудоў не рэдкасць. Яны выяўлены на тэрыторыі многіх раёнаў вобласці. На прыбярэжных і водных аб'ектах узнікаюць бані, пірсы, альтанкі для асабістага карыстання. Ёсць выпадкі, калі на пірсах ставіліся металічныя дзверы на замку. А вось саміх уладальнікаў чамусьці знайсці было цяжка.

Многія аблюбавалі прыбярэжную паласу Воўпаўскага вадасховішча. Аб'екты тут растуць як грыбы пасля дажджу. Не паспелі знесці тры самавольныя пабудовы, як з'явіліся новыя. Восенню выяўлена больш за 30 самавольных пабудоў, у тым ліку лазняў і альтанак. Такія факты назіраюцца ў шэрагу сельсаветаў Гродзенскага раёна. У мінулым годзе пракуратурай выяўлены факты самавольнага будаўніцтва прычалаў і пірсаў на беразе Нёмана і Котры. Вінаватыя панеслі пакаранне. А вось рашэння аб добраўпарадкаванні гэтых зон для калектыўнага адпачынку сесія райсавета так і не прыняла, хоць на грамадскіх слуханнях гэта ідэя была падтрымана.

У аддзеле землеўпарадкавальнай службы Гродзенскага райвыканкама паведамілі, што ўсе самавольныя пірсы каля Нёмана будуць перададзены на баланс мясцовых сельвыканкамаў. Зараз вызначаецца іх кошт. Фермеру, які пабудаваў альтанку ў аграгарадку Азёры, прызначаны штраф у памеры 110 базавых велічынь.

### Пушча пад забаронай

У Свіслацкім раёне мясцовы фермер пачаў будавацца на тэрыторыі Белавежскай пушчы. Па словах прадстаўнікоў улады, ён збіраўся ўзводзіць аграсядзібу, але пабудаваў пакуль толькі лазню. Маўляў, тут знаходзіцца былая сядзіба яго бацькоў. Між тым прыватнае будаўніцтва ў пушчы забаронена. Можна ўзводзіць, напрыклад, альтанкі. Але для агульнага карыстання і, безумоўна, па ўзгадненні з мясцовымі ўладамі. А тут вялося будаўніцтва адразу цэлага комплексу. Прытым ён узводзіўся не за ноч, а за працяглы перыяд. Далёка не кожнаму ўдаецца прыватызаваць прывабны куточак нацыянальнага парку.

Спецыялісты пракуратуры задаюцца пытаннем: куды глядзелі адказныя службы раёна, калі высякаліся дрэвы і будаваўся зруб? Ці не адбудзецца так, што пабудова ў нацыянальным парку ў хуткім часе будзе ўзаконена?

**Як паведамілі прадстаўнікі ўлады, лазня на тэрыторыі сядзібы знесена, прыбрана таксама і агароджа, іх уладальнік атрымаў штраф. Што рабіць з домам, вырашаць мясцовыя ўлады. Органы пракуратуры патрабуюць разабрацца з гэтай сітуацыяй да канца года.**

**Анатоль ДАРОЖКА, старшыня КГК Гродзенскай вобласці:**

***— Выкананне законаў, якія рэгламентуюць зямельныя адносіны, не страчвае сваёй актуальнасці. Па-першае, гэта пытанне эканомікі, бо зямля павінна працаваць, і працаваць эфектыўна. І наогул, беларусы заўсёды з асаблівым пачуццём адносіліся да зямлі-карміліцы. Як яны будуць глядзець на ўладу, якая дапускае той жа самавольны захват зямлі, будаўніцтва аб'ектаў у забароненых водаахоўных зонах? Гэта ж усе бачаць! Як і тыя ўчасткі, што пустуюць не адно дзесяцігоддзе, зарастаюць бур'янам. Быццам уласнікаў знайсці немагчыма. І нікому да гэтага справы няма.***

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

ЛЕПШ ПАПЯРЭДЗІЦЬ

## Каб не было пагрозы

**У Віцебскім аблвыканкаме нядаўна была агучана неабходнасць больш актыўнага зносу аварыйных дамоў і збудаванняў. У кароткі тэрмін трэба зруйнаваць тое, што ўяўляе асаблівую пагрозу для людзей. Адпаведную задачу паставіў губернатар.**

Гэта неабходна зрабіць, каб не траўмаваліся і не гінулі людзі. Нельга дапусціць, каб паўтарылася магілёўская трагедыя з абвальваннем на дзяцей канструкцый недабудаванага катэджа.

На Віцебшчыне, як вядома, самая вялікая колькасць у краіне населеных пунктаў. Адпаведна, і параўнальна шмат нерухомасці, якая не выкарыстоўваецца.

Паводле інфармацыі фонду «Віцебскаблмаёмасць», каля 300 аб'ектаў неабходна знесці да канца года і ў 2018-м. За 10 месяцаў спісалі, знеслі, дэманціравалі больш за 100, у тым ліку і прыватнай уласнасці...

Каб актывізаваць працэс, распрацоўваецца пытанне прыцягнення да зносу розных дзяржаўных арганізацый, бізнес-структур, якія маюць неабходную тэхніку. Ёсць ідэя папрасіць аб дапамозе і ваенных.

Дарэчы, усё больш ахвотных купляць на аўкцыёнах будынкі, якія не выкарыстоўваюцца, пад жыллё. Напрыклад, нядаўна за базавую велічыню пакупніку прадалі сельскія Дом культуры, бібліятэку, а таксама нежылы будынак у Верхнядзвінскім раёне.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

У КОЖНЫ ДОМ

## У Клічаве заняліся вермітэхналогіямі

**«МС» ужо паведамляла пра тое, што ў Клічаве распрацавана цікавая ініцыятыва «Вермікантэйнер у кожны дом». Яна рэалізуецца сумеснымі намаганнямі сярэдняй школы №2, прадпрыемства «Жылкамгас» і фермерскай гаспадаркі «Канстанта арт» у рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь».**

На працягу паўгода ў Клічаве прайшлі дзевяць інфармацыйных сесій і семінар для насельніцтва, дзе падрабязна расказвалася пра карысную тэхналогію, паведаміў **дырэктар клічаўскага Жылкамгаса Андрэй МАЦЮШОНАК.** А нядаўна адбылася раздача кантэйнераў насельніцтву. Усяго іх было закуплена за кошт міжнароднай дапамогі 167. Дзесяць засталося на балансе школы — дзеці будуць назіраць за тэхналогіяй прыгатавання кампосту, некалькі кантэйнераў узятыя на ўзбраенне фермерскай гаспадаркай, якая падзялілася з насельніцтвам патомствам каліфарнійскіх чарвякоў для прыгатавання біягумусу, астатнія перададзены жыхарам вуліцы Чырвонаармейская. Карысць ініцыятывы ў тым, што насельніцтву прывіваецца правільнае стаўленне да раслінных адходаў, а камунальнікі нясуць менш выдаткаў на вываз раслiннага смецця на палігон і яго пахаванне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# З ВІДАМ НА ЎТУЛЬНЫ ДВОР

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Час нялёгкі, фінансаванне адпаведнае, таму прыходзіцца ісці ў народ, — канстатуе яна. — Размаўляем, праводзім сходы, каб прыцягнуць насельніцтва да добраўпарадкавання двароў, рамонту пад'ездаў. Сёлета вясной правялі сход і сумесна з жыхарамі дамоў 23, 25, 27 прынялі рашэнне зрабіць у двары перамены. Ён быў шэры і няўтульны, усё дзіцячае абсталяванне старое і разламанае. Мы яго дэманціравалі і зрабілі новае. Жыльцы за свой кошт набылі будматэрыялы, а наш спецыяліст Аляксей Дамарадаў, мастацкі талент якога раскрыла работа ў нас, зрабіў цудоўныя скульптуры. Вясной падчас суботніка пасадзілі бярозавую алею, жыхары самі прывезлі бярозкі. Прыгожа атрымалася. Дзеці дапамагалі размалёўваць дэкаратыўныя фігуркі. Працы было шмат, але з дапамогай жыхароў за дзень справіліся. І 1 чэрвеня на Дзень абароны дзяцей урачыста адкрылі абноўлены двор у прысутнасці дэпутатаў і мясцовага кіраўніцтва. Паўгода прайшло, а дворык наш стаіць і ніхто нічога не псуе. Праўду кажуць: тое, што зроблена сваімі рукамі, болей цэніцца.

## БЫЛО ТАК, ШТО ХАЦЕЛАСЯ ПЛАКАЦЬ

У мікрараёне гэта не адзіны выпадак, калі насельніцтва супрацоўнічае з камунальнікамі. Начальнік ЖЭУ ўспамінае, як аднойчы да яе прыйшлі пажылыя людзі і папрасілі на пляцоўцы па вуліцы Якубоўскага, 33 зрабіць лаўкі. І зноў жыхары падставілі сваё плячо. З іх дапамогай тут не толькі 16 садовых лавак зрабілі, а наогул, як цяпер жартуюць, цэлую Белавежскую пушчу. Будматэрыяламі цалкам забяспечыла насельніцтва. Кожны прыносіў, што мог, для лавак са сваіх гаражоў, работнікі ЖЭУ іх «зварылі» і атрымалася нябłага.

— У нас жа рабіць дабро не было з чаго, а тут агульнымі сіламі пастараліся, — кажа начальнік ЖЭУ. — Наш Дамарадаў зрабіў зубра, сямейства кабаноў, аленяў, лася. Мужчыны павыходзілі з дамоў, дапамагалі капаць, устанаўліваць скульптуры. У нас у ЖЭУ ўсяго шэсць рабочых, мы адны не справіліся б. А так за дзень усё зрабілі. Цяпер там цудоўная зона адпачынку. І пажылыя сядзяць, і матулі з калясками гуляюць. Асабліва радуе, што моладзь ахвотна падтрымлівае нашы пачынанні. Вясной жыхары аднаго двара збіраюцца купіць дзецям пластмасавы комплекс для гульняў за кошт сваіх сродкаў. Усе хочуць, каб было прыгожа.

Асаблівага сакрэту, як заахвоціць людзей, тут няма. Маргарыта Цітова лічыць, проста трэба часцей з імі сустракацца. І тут вялікую ролю іграе савет тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Адзін актыўны чалавек гэта, магчыма, і не пацягнуў бы, а калі іх некальківі — зусім іншая справа.



**Маргарыта ЦІТОВА дэманструе пацвярджэнні таго, што дамавы камітэты ЖЭУ №6 працуюць добрасумленна.**

**«Раз на месяц наш савет збіраецца для разгляду праблемных сем'яў і грамадзян, а заадно абмяркоўваем стан двароў і пад'ездаў, — кажа мая суразмоўніца. — У канцы года распрацоўваем план дзеянняў на наступны. Старшыні дамкамаў дапамагаюць мабілізаваць народ і ўцягнуць яго ў грамадскую дзейнасць».**

Маргарыта Цітова прызнаецца, што калі толькі прыйшла працаваць у гэта ЖЭУ, нават баялася вечарам хадзіць па мікрараёне. Дрэвы, кусты разрасліся так, што месцамі ствараўся зараснік... Часткова парадак тут паспелі навесці яшчэ да выхаду ў свет новага Жыллёвага кодэкса, які забараніў абнаўляць дваровыя тэрыторыі за кошт адлічэнняў жыхароў на капрамонт — цяпер гэты артыкул цалкам фінансуецца з бюджэту, але грошай, як вядома, не хапае.

— Зараз усё залежыць ад саміх жыхароў, — кажа Маргарыта Аляксееўна. — Як толькі наша каманда сфарміравалася, мы пайшлі ў народ, пачалі разам працаваць і наводзіць парадак. Сёння мікрараён лічыцца адным з найлепшых. Таму і ўзнагарод шмат. І за самы лепшы двор, і за самы лепшы пад'езд — кожны год нешта атрымліваем. Нават месца на сцяне ў маім кабінеце не хапае. Летась наш дамавы камітэт занеслі на раённую Дошку гонару, нават тэлебачанне нас здымала.

## ЦЯПЕР ЯШЧЭ І Ў ІНТЭРНЭЦЕ

На тэрыторыі ЖЭУ 25 двароў, 99 дамоў, дзе жыве 15 тысяч жыхароў. «Ёсць, вядома, двары і працэйшыя, — не хавае дэпутат. — Але ўсе з дзіцячым гульнявым абсталяваннем, пафарбаваныя, усюды кветнікі. Кожны год мы нешта новае ўносім, і закінутых тэрыторый у нас няма.

**Сяргей ІВАНОЎ, старшыня Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў:**

— Саветы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання займаюцца і прафілактыкай правапарушэнняў, і работай з праблемнымі сем'ямі і адзінокімі грамадзянамі, ветэранамі вайны і гэтак далей. Але добраўпарадкаванне займае вядучае месца. Каб павысіць ролю органаў тэрытарыяльнага самакіравання, мы ў кожны СТГС, а іх у нас 27, увялі дэпутатаў гарсавета. А тры саветы яны ўзначальваюць. Мы прыйшлі да высновы, што цэнтрам грамадскага самакіравання ў мікразоне з'яўляецца школа. Там працей за ўсё арганізаваць работу з бацькамі. Адна з нашых дэпутатаў — дырэктар школы, яна ж старшыня СТГС. Праводзім агляды дзейнасці сярод калектыўных і індывідуальных актывістаў. І ўсё вырашаецца адкрыта, у прысутнасці вялікай колькасці дэпутатаў. Кожны свой пункт гледжання адстойвае. Да таго ж мы ў сваім соку не варымся. У 2015 годзе правялі выязное пасяджэнне дэпутатаў нашага і Віцебскага гарсаветаў, знаёміліся з вопытам працы. Развіваемся, знаходзім новыя формы і метады. Галоўнае — бачыць ініцыятыўных людзей і заахвочваць іх маральна і матэрыяльна. У нас ёсць у адным з раёнаў прыватнага сектара вуліца Яраслаўская — там маладзёжны актыў, што асабліва прыемна.

Штомесячна праводзяцца рэйдавыя мерапрыемствы па прыватным сектары, калі ўчастковы, прадстаўнік ЖРЭУ, супрацоўнік МНС, санстанцыі, адміністрацыі горада сумесна кантралююць якасць уборкі каля дамоў. Папярэджанне, прадпісанне, хто не разумее — пратакол, прафілактычная гутарка, — у ход ідуць усе формы і метады.



**Гэтыя лаўкі з'явіліся тут дзякуючы дапамозе жыхароў.**

На жаль, пакуль няма магчымасці вызваліць двары ад транспарту. Мікрараён будаваўся ў той час, калі машыны былі ў лічаных людзей. Нават пры капрамонце не атрымліваецца пашырыць месцы для паркоўак. Камунальнікі заклікаюць не загараджваць праезды, але ўсе разумеюць, што трэба ж кудысьці гэты транспарт ставіць. «Калі людзі скардзяцца, што аўто паркуюць проста пад іх вокнамі, звяртаемся да ДАІ, каб устанавілі загараджальныя тумбы, — адзначае начальнік ЖЭУ. — Выразных размежаванняў паміж пешаходнай зонай і праездджай часткай няма, вось аўтаўладальнікі і карыстаюцца гэтым. У нас у раёне тры вялікія аўтастаянкі, але яны пустуюць. Прымусіць карыстацца імі людзей не атрымліваецца — ім прасцей кінуць машыну каля дома. Так што невядома, калі машыны знікнуць з нашых двароў».

Сёння Савет тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання №6 смела выкарыстоўвае ў сваёй рабоце сучасныя тэхналогіі. Старшыня СТГС, дырэктар школы №27 Людміла Здорыкава расказвае, што, паколькі большасць школьнікаў пражывае менавіта на гэтай тэрыторыі і іх бацькі часта заходзяць на сайт школы, вырашылі зрабіць на ім і старонку СТГС.

— Гэта інавацыйны праект, які нам дапамаглі рэалізаваць студэнты, — кажа яна. — Жыхары там могуць выказваць свае прапановы, задаваць пытанні. Ёсць нарматыўна-прававая рубрыка, завочныя экскурсіі, прэзентацыйная справаздача за мінулы год, зваротная сувязь. Супрацоўнічаем таксама з валанцёрамі, разам з імі праводзім дабрачынныя акцыі, наведваем з падарункамі дзяцей у псіхіятрычнай бальніцы, Дом дзіцяці.

**Вельмі згуртоўваюць жыхароў агульныя святы двара. ЖЭУ традыцыйна ладзіць асенні кірмаш, свята да 1 верасня, да Дня Перамогі... У іх рамках праходзяць выстаўкі твораў мясцовых талентаў, свае акцыі праводзяць работнікі, ДАІ, запрашаюць вайскоўцаў з іх паходнай кухняй. Апошні раз, калі праводзілі Дзень маці, у госці завіталі фізкультурныя клубы.**

— Жыхары прывыклі дапамагаць, мы з імі як адна сям'я, — усміхаецца Маргарыта Цітова. — Напішам на дошках аб'яву «Дапамажыце» — і яны адгукаюцца. Мы самі павінны быць зацікаўлены ў рэалізацыі нейкага праекта, а потым можна ісці з прапановамі да людзей.

***P. S.** Зрабіць свой двор і горад лепшымі можна і з дапамогай мабільнай праграмы «Утульны горад». Яна спампоўваецца бясплатна з сэрвісу play market. Магілёўскія камунальнікі прапанавалі сёлета такую форму супрацоўніцтва з насельніцтвам, каб зрабіць горад яшчэ ўтульнейшым і прыгажэйшым.*

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

**Андрэй КІБЛОЎ, генеральны дырэктар Упраўлення камунальных прадпрыемстваў г. Магілёва:**

— Штогод распрацоўваецца план, дзе адлюстроўваюцца ўсе тэрыторыі горада і тое, што трэба зрабіць — колькі лавак паставіць, колькі метраў пешаходных дарожак адрамантаваць, колькі пасадзіць дрэў, кустоў, кветак. Гэты план друкуецца ў сродках масавай інфармацыі, згодна з ім выконваем работы. Сёлета мы адрамантавалі 35 тысяч квадратных метраў дваровых праездаў — амаль у 2 разы болей, чым летась, 2 тысячы квадратных метраў пешаходных дарожак — улічваючы, што шырыня сярэдняй дарожкі 75 сантыметраў — 1 метр, практычна 2 кіламетры дарожак, пасадзілі разам з жыхарамі каля 1000 дрэў і кустоў. І 5 дваровых тэрыторый сёлета прыводзіліся ў парадак разам з жыхарамі. Сёлета ў Магілёве рэалізуецца цікавы праект, які зробіць дваровыя тэрыторыі яшчэ прывабнейшымі для людзей. Датычыцца ён выключна новабудоўляў. Гэта калі на дваровай тэрыторыі для 4 жылых дамоў няма стаянак для машын, толькі праезд для спецтэхнікі — хуткай дапамогі, таксі і гэтак далей. Унутры дамоў толькі дзіцячая пляцоўка, а паркоўка знаходзіцца за дамамі.

Налета запланаваны капрамонт трох дваровых тэрыторый за кошт бюджэту. Там будуць зроблены і праезды, і пешаходныя дарожкі, пастаўлена новае дзіцячае абсталяванне.

Апошняе, што мы цяпер актыўна ўкараняем, — і гэта таксама паляпшае выгляд нашых двароў — гэта ўстаноўка паглыбленых кантэйнераў для збору смецця. У горадзе імі абсталявана ўжо болей за 70 дваровых тэрыторый. Такога пакуль няма нідзе ў краіне. Мы лічым, што гэта вельмі добры варыянт, як зрабіць нашы двары больш утульнымі і прывабнымі. У Магілёве болей за 300 дваровых тэрыторый, і калі і надалей Міністэрства ЖКГ будзе нас падтрымліваць, мы гэтую работу працягнем.

**МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ** ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета адрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 12 снежня 2017 года.**